Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 01 (2851) Год LVI | Беласток, 2 студзеня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

АДЗНАЧАЕМ СВЯТУЮ НОЧ ПА-РОЗНАМУ

На Падляшшы рашучая большасць праваслаўных адзначае Божае Раждзяство па юльянскім календары. Ад 1995 года вернікі праваслаўя, якія святкуюць Каляды па новым стылі, маюць магчымасць пайсці на святочнае набажэнства ў царкву святой Марыі Магдаліны, — расказвае СМІ айцец падпалкоўнік Ігар Сегень. Прызнаецца, што на вялікай вячэрні 24 снежня сустракае вернікаў, якіх не бачыць у іншы святочны дзень. Лічыць, што прыбываюць яны на святочную багаслужбу з іншых прыходаў Беластока, або і з-па-за горада, а пасля амаль дзвюх гадзін ідуць адзначаць дома куццю па новым стылі. У іншых прыходах спробы святкавання Каляд па новым стылі не ўдаліся. Гэтую магчымасць мешаным каталіцка-праваслаўным сем'ям правесці супольнае святкаванне запрапанаваў яшчэ епіскап Сава, цяперашні мітрапаліт варшаўскі і ўсяе Польшчы. Некаторыя вернікі прыйшлі таксама крыху з цікаўнасці.

Вялікая вячэрня ў царкве, якой карыстаецца вайсковае душпастырства, была назначана на 16 гадзіну. Штогод прыходзіць на яе больш чым сто асоб. Як адзначыў а. Ігар Сегень, лік не мяняецца. Большасць асоб адзначае святы ў двух чыслах, сярод іх ёсць праваслаўныя, прыехаўшыя на Беласточчыну з іншых частак краіны, якія ўжо звыкліся адзначаць праваслаўныя святы па новым стылі, паколькі ў іншых рэгіёнах краіны, асабліва ў вялікіх гарадах, такіх як Варшава, Вроцлаў ці Кракаў, праваслаўнае Раждзяство Хрыстова адзначаецца 25 снежня. Духоўнікі лічаць, што гэта вырашаюць вернікі, якія выбіраюць тэрмін адзначання святаў. Паводле падлікаў іерархаў, ва ўсёй Польшчы налічваецца 500-600 тысяч праваслаўных вернікаў, з чаго палова пражывае ў Падляшскім ваяводстве, перш за ўсё ў Беластоку і паўднёва-ўсходняй частцы рэгіёна. Хоць няма дакладных даных, праваслаўнае духавенства лічыць, што ў некаторых прыходах Беластока нават кожны трэці шлюб з'яўляецца мешаным каталіцка-праваслаўным.

— Вы таксама з мешанай сям'і? — пыталіся перад уваходам у царкву вернікі адны ў адных, рэдка знаёмыя. Прыйшлі сюды маладыя пары, некаторыя з малымі дзецьмі, старэйшыя сужонствы, жанчыны з пажылымі маці, паасобныя вернікі, якія спявалі разам з мужчынскім хорам усе пенні па ходзе набажэнства ды калядкі — па-беларуску, па-ўкраінску і па-руску. Запоўнілася капліца, аздобленая золата-белымі колерамі з ёлкай у тых жа колерах і шатах святароў — у колерах Хрыста. Разам з хорам вернікі ўсхвалялі: „З намі Бог", дзе выказваецца радасць народу Божага, што Збавіцель свету знаходзіцца неразлучна ад людзей, і ніякія нягоды не страшныя. Чыталася Евангелле ад Лукі пра нараджэнне Ісуса Хрыста, які „нас ради чеовек и нашего ради спасения сшедшего с небес, и воплотившегося от Духа Свята и Марии Девы и вочеловечася", Евангелле ад Мацьвея пра пакланенне мудрацоў, паказваючы, што нараджэнне Хрыста мела не мясцовае, а ўніверсальнае значэнне. У царкоўных службах гэтага дня ўсхваляецца цудоўнае нараджэнне Бога ад Найсвяцейшае Дзевы Марыі, якая «насіла ва ўлонні сваім Спрадвечнага і Недасяжнага, адзінасутнага з нябачным Айцом, адзінае і не злітнае ў Тройцы Боства». Хрыстос, «прыйшоўшы ад Дзевы Маці і не зазнаўшы ніякае змены... застаецца тым, кім быў — сапраўдным Богам, — і прымае тое, чым не быў, стаўшыся чалавекам дзеля чалавекалюбства. Ён — Вобраз славы Айца, што быў і заўжды ёсць, і заззяў ад Дзевы", наступіла з'яднанне з сусветам, лікуючым Нараджэнне Хрыста, спеў вячэрняй малітвы „Спашлі, Госпадзі, у вечар гэты без граху захавацца нам...", малітвы праведнага Сімяона „Цяпер адпускаеш", трысвятога: малітвы Святой Тройцы; „Ойча наш"; „Багародзіца Дзева, радуйся", трапароў...

На другі дзень, 25 снежня, на ютрані, у царкоўцы св. Марыі Магдаліны паявілася вернікаў менш. Традыцыйна святкавалі яны ўжо першы дзень Божага Раждзяства ў сем'ях ці рыхтаваліся да другога адзначання Каляд. Справа святаў, усё ж, шчырым праваслаўным прыносіць духоўную турботу — адпаведным было б і захаванне посту, і іншых прынцыпаў, датычных прававернасці. У каталіцызме, вось, наступае лібералізацыя — нават Куцця ўжо не мусіць быць поснай. Дата нараджэння Хрыста таксама ўмоўная, адносная — прынятая пры вялікай нацяжцы з паклонам да язычства. Святкаваць яго пачалі ў 354 годзе, а тэрміны лічылі на... красавік, кастрычнік, лістапад... Канчаткова іерархі вызначылі яго на ноч 6 студзеня.

Плошча і Праўда

У нас была гэтая Плошча. Дзе з нашага боку былі дзесяткі тысяч мірных людзей, а з іхнага — узброеная ваенная хунта. Дзе з нашага боку былі справядлівыя законныя патрабаванні, праўда, наша бел-чырвона-белая сімволіка, а з іхнага — садысты ў форме „касманаўтаў", правакацыі і хлусня, чорная справа задушэння свабоды. Дзе з нашага боку адкрыта былі лідары нацыі, а з іхнага — узурпатар, што схаваўся за мурамі і міліцэйска-вайсковымі шыхтамі.

Беларусь прачнулася 20 снежня ў новай краіне. Не, цуда не здарылася і змены ўлады не адбылося. Адбылася лагічная для гэтай дзяржавы, паслядоўная ў рэчышчы яе палітыкі, але страшная падзея. Адкрыта было прадэманстравана і сказана, што ніякія законы ў гэтай дзяржаве не дзейнічаюць, а ўсё падпарадкавана злой волі аднаго чалавека, якую выконваюць тысячы памагатых — адны фальшуюць выбарчыя бюлетэні і вынікі галасавання, іншыя азвярэла б'юць безабаронных мірных суграмадзян дубінамі па галаве, яшчэ адны ноччу ламаюць дзверы ў кватэры і робяць вышукі, яшчэ адны ў мантыях засуджваюць нявінных да зняволення, яшчэ адны па-гебельсаўску хлусяць з тэлевізараў і ўладных газет суайчыннікам, дурманячы ім галовы подлай маной. Ва ўсіх іх рукі ўжо ў крыві. Пра што казаць, калі ў цэнтры беларускай сталіцы законных кандыдатаў у прэзідэнты (!) збіваюць да паўсмерці? Самым страшным для хунты стаў хрысціянскі лозунг „Гавары праўду!". Да гэтага не вядома ці ўсе, каго білі пераапранутыя і ў дзяржаўнай форме карнікі за праўду і смелую грамадзянскую пазіцыю, жывыя. Сотні па-бандыцку схопленых людзей знаходзяцца ў турэмных засценках. Многія з іх сустрэнуць Каляды і Новы год не са сваімі блізкімі і роднымі, а за кратамі. Сапраўдным лідарам нацыі — а такімі паказалі сябе Уладзімір Някляеў, Віталь Рымашэўскі, Андрэй Саннікаў і Мікола Статкевіч, а таксама іх паплечнікам і мужным журналістам рэальна пагражае шматгадовае зняволенне. Усё гэта называецца проста — звычайны фашызм. Ён яшчэ не дасягнуў размаху і вялікага маштабу, але па-сутнасці абвешчаны і выразна прадэманстраваў сваё аблічча. Супраць народа, усіх сумленных і патрыятычных людзей Беларусі ідуць жорсткія рэпрэсіі, сапраўдная вайна.

Праўда і ў тым, што гэты рэжым выгадаваны быў у маскоўскім Крамлі, ім жывіцца і падтрымліваецца ўжо 16 гадоў. Праўда і ў тым, што заходняя, найперш еўрапейская палітыка, у дачыненні да дзяржавы з назвай Беларусь выявіла ўсю сваю гнілую сутнасць. Ці ж гэтыя еўрапейскія камісары і эмісары не ведалі з кім і з чым маюць справу? Яны ўжо рыхтаваліся прызнаць псеўдавыбары законнымі і далей фінансаваць рэжым сваімі крэдытамі. А зараз няўклюдна спрабуюць апраўдацца, гаворачы ў заявах пра „непрапарцыйнае" ўжыванне надбеларускай уладай сілы. Яшчэ адзін цікавы эўфемізм! Як гэта па іхнаму „прапарцыйна" — не біць дручком па галаве, а толькі па плячах? Ці не біць па галаве два разы, а толькі адзін? Можа паліткарэктнасць і патрэбная — у дыпламатыі, міжнародных перамовах, але не ў ацэне такой адназначнай падзеі, якая здарылася ў Беларусі.

І яшчэ пра адно ў гэтыя калядныя дні. Беларусам надзвычай патрэбная хрысціянская вера, патрэбныя праваслаўе і каталіцтва. Але непатрэбныя такое праваслаўе і такое каталіцтва, якое маем зараз. І гутарка не толькі і не столькі ў небеларускім пераважна іх абліччы. Размова пра тое, што гэтыя канфесійныя сістэмы цудоўна ўжываюцца з тым злом, якое сёння пануе ў Беларусі і нават служаць палітычнаму рэжыму. Я не пра тое, што яны мусяць ісці на нашу Плошчу, але калі Царква і Касцёл па-за палітыкай, то яны не мусяць хадзіць на „ўсенародныя зброды", якія ладзіць рэжым. А яны там сядзяць у прэзідыумах і ложах пачэсных гасцей. Таму нам непатрэбныя гэтыя фарысейскія, фальшывыя віншаванні іерархаў — барадатых у мітрах і гладка паголеных у піусках. Нам, беларусам, непатрэбны такі „свяцейшы" крамлёўскі патрыярх і такі ватыканскі пантыфік, якія прымаюць дыктатара як пачэснага госця. Пасля „крывавай нядзелі" ўсе яны баязліва прамаўчалі, а некаторыя і павіншавалі ўзурпатара з „перамогай". Дык каму яны служаць?

Асабіста мне дастаткова і шчырага штогадовага віншавання айца Аляксандра Надсана. А Хрыстос заўсёды з намі, пакуль мы за праўду, пакуль мы пад яго святым бел-чырвона-белым сцягам!

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Мая першая школьная ёлка

Добра памятаю сваю першую ёлку ў пачатковай школе ў Малінніках. Гэта быў студзень 1987 года. Пятніца. Вечар у роднай хаце. Гадзіна 8-ая вечара. У тэлебачанні пускалі фільм з Полем Ньюманам, амерыканскай кіназоркай 80-х гадоў. Бацькі гатовілі мне падарунак, які мама раней прывезла з Бельска. Бацькі пакавалі яго ў картонную скрынку і абклейвалі шэрай паперай. У падарунку былі апельсіны, шакалад, яблыкі ды цукеркі. Гэта былі ласункі, якіх у гэтым часе дзеці штодзень не елі. Такія падарункі рабілі ўсе бацькі, каб дзеткі ўспаміналі смак дзяцінства ўсё жыццё.

Ёлка ў школе заўжды адбывалася пасля Каляд паводле юльянскага календара, больш-менш каля Новага года, прыблізна каля 14 студзеня, і ў суботу. Да ёлкі рыхтаваліся не толькі бацькі, але і настаўнікі, якія разам з дзецьмі ставілі тэатральныя сцэнкі. Настаўніца беларускай мовы матушка Марыя Саевіч з вучнямі рыхтавала беларускія сцэнкі, а паланістка Аліна Зінкевіч — польскія. Аднак на ёлцы было больш беларускамоўных сцэнак. У апошнія дні перад ёлкай настаўнікі гатовілі дэкарацыю сцэны. Асабліва таленавітымі сярод настаўнікаў былі Юры Сібісевіч ды Юры Назарэвіч, якія рыхтавалі дэкор сцэны. Вучні гатовілі зал, у якім даўно стаяла вялікая, рознакаляровая ёлка. Яны размалёўвалі сцены гімнастычнага зала, абклейвалі каляровай паперай ды завешвалі каляровыя паветраныя шарыкі. У навагоднюю, зімовую суботнюю раніцу, калі адбывалася ёлка, у школу прыязджалі настаўнікі, ішлі дзеткі з бацькамі. Ёлка пачыналася з тэатральных выступленняў дзяцей на калідоры на першым паверсе малінніцкай школы. На пачатку выступалі малыя дзеткі, а ў канцы — старэйшыя вучні. Сцэна была састаўлена з партаў, а на крэслах сядзелі бацькі ды настаўнікі. Асабліва бацькі цешыліся сваімі маладымі артыстамі. Для бацькоў яны былі важнейшымі чымсьці зоркі кіно і эстрады. А сцэнкі былі пераважна на тэму Каляд. Гэта было ўрачыстае свята як для вучняў, так і для настаўнікаў ды бацькоў. Асабліва запамяталася мне сцэнка, якую прадстаўлялі вучні сёмага класа. Гэта была гісторыя пра вясковага хлопца, які на Каляды прыехаў у госці да дзяўчыны, з якою летам пазнаёміўся на вёсцы. Хлопец расчараваўся, бо ў хаце дзяўчыны — яго летняга кахання — за сталом сустрэў новага хлопца гэтай дзяўчыны. Яна была здзіўленая, што вясковы хлопец надалей яе кахае, хаця яна пра яго забылася.

Пасля тэатральных выступленняў бацькі, настаўнікі ды дзеткі ішлі на супольны абед. Пасля мы з мамай ды з усімі дзецьмі пайшлі ў гімнастычны зал, дзе адбывалася найважнейшая частка школьнай ёлкі — уручэнне падарункаў. Там стаяла вялікая, рознакаляровая ёлка. Калі ўсе былі ў зале, апошнім уваходзіў Дзед Мароз. У яго была сівая барада. Апрануты быў у стары кажух, маску ды трымаў вялікі мяшок з падарункамі. За яго пераважна пераапранаўся Пётр Іванчук — найбольш жартаўлівы дзядзька з усёй вёскі. Дзядзька Пётр працаваў сторажам у нашай школе. Дзед Мароз быў для нас найважнейшым, бо ён раздаваў падарункі. Перад гэтым ён вычытваў імёны і прозвішчы ўсіх дзетак, прасіў сказаць вершык ці праспяваць песеньку. Таксама пытаў ці дзіця было добрае для бацькоў і ці добра вучылася. У рэшце рэшт уручаў падарункі, якія раней нам зрабілі бацькі. Усе дзеці чакалі таго моманту, калі Дзед Мароз пакліча іх да сябе. Пасля ўручэння падарункаў пачыналася школьная дыскатэка, на якой гулялі ўсе дзеці, бацькі ды настаўнікі. Каля ёлкі ставілі парту, на якой стаяў магнітафон. Касеты з музыкай пускалі найстарэйшыя ў школе хлопцы, якія, так сказаць, былі тадышнімі школьнымі дыджэямі. У 1987 годзе папулярнымі былі такія хіты як „Каома — Ламбада", і гурты „Модэрн Токінг" ці нашы „Дубіны". Вечарам дахаты вярталіся радасныя бацькі і дзеці, задаволеныя з ласункаў ды свята, якое запамяталася ім на ўсё жыццё.

Юрка БУЙНЮК

Вачыма еўрапейца

Замарожаныя прадбачванні?

Ад месяца мая Польшча не мае пасла ў Беларусі. Сталася гэтак пасля таго, як у МЗС у Варшаву быў адкліканы пасол Генрык Літвін. Адносна доўга працягваўся „пошук" кандыдата на новага пасла. На канец больш за тры тыдні таму сеймавая камісія замежных спраў выслухала кандытата на гэтую пасаду. МЗС адрэкамендаваў 46-гадовага Лешка Шарэпку, раней студэнта факультэта гісторыі Варшаўскага ўніверсітэта і там дзеяча Незалежнага згуртавання студэнтаў. Кіраваў ён працамі палітычнага аддзела пасольстваў РП у Маскве і Кіеве.

— Ён — чалавек адважны ў агучванні сваіх поглядаў. У Беларусі патрабуем цяпер кагосьці такога, хто з энергіяй і адвагай будзе прадстаўляць польскія інтарэсы, — рэкамендаваў кандыдата дэпутатам цяперашні віцэ-міністр замежных спраў Генрык Літвін.

Я перагледзеў стэнаграмы з сеймавага роспыту Лешка Шарэпкі цяпер, некалькі дзён пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі і пацыфікацыі дэманстрацыі апазіцыі ў Мінску. Для мяне з'яўляецца відавочным, што ў рамках прадказваных санкцый у адносінах да афіцыйнай Беларусі, новы польскі пасол цяпер не падасць даверчых грамат Аляксандру Лукашэнку. Аднак зацікавіў мяне падыход пана Шарэпкі да г.зв. беларускай праблематыкі яшчэ ў рамках ацяплення ўзаемных кантактаў, асабліва калі ўсё паказвала на тое, што выбары ў Беларусі могуць адбыцца больш дэмакратычна чым да гэтай пары (што аказалася, вядома, ілюзіяй). І так кандыдат на пасла гаварыў — абмінаючы пытанне палякаў у Беларусі — між іншым:

— Пасольства будзе старацца спрыяць актывізацыі і інстытуцыяналізацыі дыялогу розных асяроддзяў. На асаблівую падтрымку заслугоўваюць разнастайныя ініцыятывы датычныя кантактаў прадстаўнікоў рэгіёнаў, адкрытага грамадства ды асяроддзяў грамадскай думкі і эканамічных. Мяркую, што ў будучыні паявяцца прадпасылкі для развіцця парламенцкага супрацоўніцтва. Я думаю, што Беларусь была б дасканалым дапаўненнем парламенцкага згуртавання Польшчы, Украіны і Літвы.

Гаварыўшы аб гаспадарчых пытаннях, успомніў:

— Для беларускіх фірм шанцам на атрыманне вялікіх сродкаў на мадэрнізацыю прадукцыі можа быць продаж іх акцый на Варшаўскай біржы (...). Беларусь занесена ў спісак дзяржаў трактаваных прыярытэтна пры надзяленні польскай прагрэсіўнай дапамогай. Абсяг гэтае дапамогі будзе павялічвацца. Пасольства павінна задбаць пра тое, каб дапамога была прызначана на канкрэтныя праекты, якія паскораць мадэрнізацыю беларускага грамадства.

І дадаў:

— Прыярытэтным заданнем пасольства лічу паказванне гаспадарам на прыкладзе Польшчы карысцей, якія можна здабыць дзякуючы супрацоўніцтву, а наступным чынам членству ў Еўрасаюзе. Прыняцце еўрасаюзных патрабаванняў прынесла б Беларусі не толькі павелічэнне фінансавай і эксперцкай дапамогі, але і праклавала б дарогу ў членства ў Радзе Еўропы і Сусветнай арганізацыі гандлю, што было б сугучным з інтарэсамі Польшчы.

Лешак Шарэпка выказаў таксама ахвоту стварэння ў Беларусі польскага гістарычнага інстытута. Адказваючы на пытанні дэпутатаў, заявіў:

— Магчымасць падарожнічаць у Польшчу без віз была б самым танным спосабам прапаганды еўрасаюзных ідэй. (...) Істотным таксама было б адкрыццё польскага рынку для работнікаў з Беларусі.

Шкада, што большасць з прапанаванага паслом РП у Мінску, у сувязі з падзеямі 19 снежня 2010 года, страіць сваю актуальнасць. На як доўгі час?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Дарафей Фіёнік і звязда з Бельшчыны

СВЯТЫ З ТРАДЫЦЫЯМІ І ПА-СУЧАСНАМУ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Апошнім часам ужо нават у Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы святочны настрой паяўляецца надоўга перад Ражджаством Хрыстовым, бо ўжо ў канцы лістапада. Тады стаўбы на галоўных вуліцах, установы і магазіны прыаздабляюцца лямпачкамі, усярэдзіне ўстаноў паяўляюцца ёлкі, а ў магазінах з цацкамі, вопраткай і сувенірамі ажно да самых святаў натоўпы людзей купляюць святочныя падарункі сваім блізкім. Ліхаманка перадсвяточных пакупак дайшла ўжо таксама ў сёлы. Вяскоўцы па падарункі ездзяць у гарады, а лямпачкі вешаюць перад самымі Калядамі, таму ў посны перыяд навонкі не відаць святочнага настрою, які ўліваецца ў хаты з экранаў тэлевізараў.

Падрыхтоўка пачыналася з Філіпавага посту

— Калісь не было разважанняў, ці можна есці мяса ў час Філіпавага посту, бо з яго пачыналася падрыхтоўка да Ражджаства. Людзі чысцілі каструлі перад постам, каб пазбыцца рэштак скаромнага. Зараз лекары даказалі, што пост вельмі карысны для здароўя. Калісь людзі такім чынам ачышчалі свой арганізм без навуковых доказаў, але з верай у Бога, — сказала Марыя Нічыпарук з Гайнаўкі (родам з Грабаўца), якая ахвотна сустракаецца з дзеткамі і моладдзю, вучыць іх нашым традыцыям, паказвае, як у мінулым выконваліся хатнія работы, народныя выцінанкі, кветкі і іншыя ўпрыгожанні. — У будныя дні Філіпавага посту нашы дзяўчаты пралі і вышывалі, а вечарамі па суботах і нядзелях выконвалі аздабленні, якімі ўпрыгожваліся хаты перад Калядамі. У нас выконваліся фіранкі з каляровай паперы, чаго не было ў іншых месцах Польшчы, павукі з саломы, якія падчэпліваліся пад столь, і папяровыя кветкі. У час посту спявалі мы многа калядак, якімі славілі Хрыста.

У час Філіпавага посту моладзь таксама абклейвала каляровай паперай і выцінанкамі звязду. У гэты час таксама развучвалі калядкі.

— Каб дзеткі цяпер прыйшлі з прыгожай звёздачкай і прыгожа закалядавалі, патрэбная праца бацькоў з імі. Бацька павінен дапамагчы сыну абклейваць звёздачку, а ў час посту сямейнікі павінны супольна спяваць калядкі, як было ў мінулым, — лічыць фалькларыст і гісторык Дарафей Фіёнік.

Два гады таму ў Філіпаў пост у Свята-Троіцкім прыходзе ў Гайнаўцы арганізаваны былі заняткі, у час якіх моладзь пад наглядам Уладзіміра Петручука вучылася выконваць і абклейваць звязду і развучвала калядкі. Падобныя заняткі ладзіліся таксама ў Музеі малой айчыны ў Студзіводах і ў некаторых дамах культуры. Канешне, такія заняткі не заменяць працы бацькоў па захаванні калядных традыцый, але могуць даць стымул для бацькоў, каб папрацавалі ў гэтым напрамку са сваімі дзеткамі.

Поснае харчаванне было ў нашых вёсках падобным, часта рыхтаваліся супы з грыбамі, грыбная капуста і аладкі, а чырвоныя буракі надта смакавалі з бульбай акрашанай канапляным ці ільняным алеем. Гэтыя ж самыя стравы паяўляліся таксама на стале ў час Куцці ў суправаджэнні іншых прысмакаў, хаця б пірага з макам, ці шчолку з сушаных яблык і груш. Апошнім часам, калі частка праваслаўных вітае новы год паводле новага стылю і наведвае каталікаў у час іх святаў, нашы святары заклікаюць звяртаць большую ўвагу на духовы аспект Філіпавага посту і Ражджаства Хрыстовага, бо само спажыванне нескаромнага харчавання не зробіць чалавека лепшым, хаця і без гэтага цяжка пазбыцца грахоўных прывычак. Аднак частка людзей пачала браць прыклад падрыхтоўкі да святаў і самога святкавання з тэлеперадач і фільмаў, дзе ў вялікім маштабе ўваходзіць камерцыя.

— Па вёсках людзі пасцілі раней і посцяць цяпер, толькі што там жывуць у асноўным старэйшыя людзі. Жыхары гарадоў сталі адвыкаць ад посту і, напрыклад, у сямідзесятых гадах амаль перасталі ў Бельску пасціць. Зараз пануе лепшы клімат да захоўвання постаў, у гэтым ліку і Філіпавага. Напрыклад, у Бельску пасціць пачалі дзеткі і моладзь, якіх вучаць так рабіць на занятках Божага закону, а пад іх уздзеяннем да посту пачалі вяртацца старэйшыя асобы. У час Філіпавага посту ў Бельску практычна не спаткаеш праваслаўных, якія ладзілі б тады сямейныя мерапрыемствы. Канешне, вітанне Новага года паводле новага стылю і Каляды, якія святкуюць каталікі, не спрыяюць поснаму перыяду, але відаць, што ў нашым горадзе зараз штораз больш асоб святкуе Шчодры вечар паводле старога стылю, — сказаў старшыня аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах" Дарафей Фіёнік. — Што тычыцца Куцці, то ў маёй сям'і адзначаецца яе так, як было раней, у посным настроі. Святкаванне распачынаецца з першага дня Ражджаства. Шкада, што цяпер камерцыя выцясняе святкаванне паводле традыцый.

Два гады таму ў Філіпаў пост у Свята-Троіцкім прыходзе ў Гайнаўцы моладзь пад наглядам Уладзіміра Петручука вучылася выконваць і абклейваць звязду і развучвала калядкі

Інакш упрыгожваем хаты

Пасля перадсвяточнай мітусні ў магазінах, дзе чалавек вымушаны глядзець на святочнае афармленне вітрын, хочацца вярнуцца да традыцый, распачынання святкавання Ражджаства Хрыстовага з усяночнай багаслужбы, разам з сямейнікамі, праўдзівымі звёздачкамі і праўдзівымі каляднікамі, а не толькі з калядкамі з кампакт-дыскаў, нават у выкананні славутых хароў, але без жывых спевакоў. Такое можа даць яшчэ частка нашых вёсак, а Гайнаўка ці Бельск — толькі ў паасобных жыллёвых кварталах, дзе ў посны перыяд не вешаюць яшчэ бліскучых лямпачак, а на першы або і другі дзень Ражджаства ходзяць каляднікі. Аднак мода на каляровае і бліскучае вонкавае ўпрыгожванне хат і дрэўцаў перад імі ў час святаў і ў паслясвяточны перыяд прыйшла таксама і ў нашыя сёлы, хаця не прынялася яшчэ ў масавым маштабе. Найчасцей лямпачкі зіхацяць з панадворкаў малодшых гаспадароў. Больш масава прыаздабляюцца натуральныя і пластмасавыя ёлкі, што ставяцца ў вялікіх пакоях побач вокнаў і вечарам відаць іх з вуліцы. Толькі многія найстарэйшыя і адзінокія людзі не ставяць ужо ў сваіх хатках вялікіх ёлак. На рынку сталі цяпер прадаваць невялічкія прыаздобленыя пластмасавыя ёлачкі, якія бабулькам сталі купляць іх гарадскія дзеці або ўнукі. Перахоўваюцца гэтыя ёлачкі цэлы год, а перад самымі святамі ставяць іх на цэнтральнае месца ў хаце.

Чакаюць, каб іх наведаць

Старэйшых адзінокіх людзей не задавальняе ўжо сам парадак у хаце і яе прыаздабленне, як гэта было раней. Патрабуюць яны жывога кантакту з людзьмі, з калядоўшчыкамі, суседзямі, а перш за ўсё з сямейнікамі, якія часта жывуць у гарадах ці іншых сёлах. Бывае, што адзінокія старажылы святкуюць разам з героямі тэлесерыялаў, пры калядках з магнітафонных плёнак, а самай вялікай асалодай з'яўляюцца ім тэлефонныя размовы з дзяцьмі, якія жывуць далёка ад бацькоўскага дому. У некаторых дамах захавалася яшчэ традыцыя запрашаць за святочны стол адзінокіх суседзяў, але і тыя з-за сваёй сціпласці найчасцей адмаўляюцца ад такіх прапаноў. Ужо многа гадоў у Свята-Троіцкім прыходзе ў Гайнаўцы ладзяць Куццю для адзінокіх гайнавян. Яе арганізатары часта на сваіх машынах звозяць з горада старэйшых асоб і стараюцца стварыць ім радасную атмасферу менавіта ў перадсвяточны вечар, каб у калядны час адчувалі цеплыню супольнай бяседы.

(заканчэнне ў чарговым нумары)

Вялікія планы Гайнаўскай гміны

Адбыліся выбары войтаў гмін. Варта пры гэтай нагодзе ўспомніць пра Вольгу Рыгаровіч, якую ўжо некалькі разоў перавыбіралі на пост войта Гайнаўскай гміны. Гэты факт сведчыць аб тым, што працуе яна вельмі добра і карыстаецца падтрымкай мясцовага грамадства. 21 лістапада ў ходзе тайнага галасавання атрымала яна найбольш галасоў і на працягу чарговых чатырох гадоў будзе кіраваць Гайнаўскай гмінай.

Намечаныя ёю ў мінулым скліканні планы былі выкананы. Амаль ва ўсіх вёсках пракладзена ўжо каналізацыя. У Дубінах на сямі вуліцах пакладзены асфальт. Асфальтаваны таксама дарогі Махнатае — Дубічы-Асочныя, Дубічы-Асочныя — Хітра — Гайнаўка, Навасады — Сарочая Ножка, Бельшчына — Дубіны, Катоўка — Трывежа, Васількова — Катоўка, адрэзак ад ваяводскай дарогі ў Смаляны Сад і вуліца ў Трывежы. Асфальтавае палатно атрымалі таксама дарогі ў Барысаўку, Прагалі і іншыя вёскі. Мадэрнізаваная была старая школа ў Дубінах, у якой размясціўся Этнаграфічна-экуменічны цэнтр. Пры пачатковай школе і гімназіі ў Дубінах узведзены спартыўная зала ды чатыры гаражы для школьных аўтобусаў і пажарнай машыны. Была куплена аварыйна-выратавальная машына. Ва ўсіх 37 вёсках традыцыйнае вулічнае асвятленне было заменена энергазберагальным, устаноўлена падсветка цэркваў у Арэшкаве, Дубінах і Новаберазове. Апусцелыя школы былі адрамантаваны і прыстасаваны пад вясковыя святліцы.

А ў планы на чарговае скліканне занесены, між іншым, стварэнне ўмоў для будовы керамічнага завода ў Трывежы, пракладка газаправода, будова сучаснага дзіцячага садка, каналізацыя астатніх вёсак, будова прыхатніх установак ачысткі сцёкавых вод, мадэрнізацыя воданапорных станцый у Новаберазове і Арэшкаве ды ачышчальні ў Махнатым, стварэнне Цэнтра экалагічнай адукацыі ў Арэшкаве, будова спартыўных пляцовак у Новаберазове і Дубінах, стварэнне дома сацыяльнай апекі. Плануецца таксама разбудова дарог, пракладка тратуараў і забеспячэнне жыхарам вёсак доступу да інтэрнэту.

Як бачым — планы вялікія. Каб толькі яны былі выкананы.

Андрэй ЯЛОЗА

Беласток

Па гарачых слядах

Я часта езджу аўтобусамі гарадской камунікацыі лініі № 13 у Беластоку. 8 снежня г.г. я быў у вялікім гандлёвым магазіне „Тэска" ля скрыжавання вуліц Васількоўскай, Андэрса і 27 Ліпеня. Адтуль меў намер ехаць у Саўляны. Па вуліцы 27 Ліпеня ездзіць у яе канец аўтобус лініі № 13 і да скрыжавання з кругавым рухам аўтобус лініі № 6. На першым аўтобусным прыпынку на вул. 27 Ліпеня не знайшоў я раскладу язды 13-ткі, а толькі лініі 6. Падумаў, што тут 13-тка не спыняецца — няма ж раскладу. Пабег я на вуліцу Васількоўскую, дзе на аўтобусных прыпынках ёсць расклады 13-ткі. Еду я трынаццаткай з Васількоўскай на 27 Ліпеня і аўтобус прыпыніўся... на першым прыпынку. Вось табе на! Чаму МЗК ці, як цяпер найменавалі — БКМ, не наклеіць раскладу лініі № 13? Не інакш, гэта кпіны з пасажыраў!

(яц)

Здзек над экспанатам

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Музей — установа, якая збірае, вывучае, зберагае і выстаўляе для агляду помнікі духовай і матэрыяльнай культуры. Аднак гэтае вызначэнне не зусім падыходзіць да Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы. Праўда, калі заснаваўся Грамадскі камітэт пабудовы беларускага музея пад старшынствам Кастуся Майсені, разам за зборам сродкаў на будову музея пачалася акцыя збору экспанатаў матэрыяльнай культуры беларусаў Падляшша. У выніку ў фондах музея сабралася шмат экспанатаў, некаторыя з якіх паказваюцца на пастаянных выстаўках. Але горш справа маецца з іх вывучэннем і кансервацыяй. А ўжо зусім непрымальным з'яўляецца стаўленне гайнаўскіх гора-музейнікаў да воўначасальнай машыны, якой больш за сто гадоў. Гэты ўнікальны экспанат пару гадоў таму трапіў сюды з Сакольшчыны. Першапачаткова змясцілі яго ў музейным памяшканні, а пазней, калі памяшканне спатрэбілася для іншых мэт, ваўначоску выдварылі на музейны пляц. І стаіць яна сабе ўвесь год пад адкрытым небам, зверху прыкрытая фольгай і анучамі, ды нішчэе.

Хачу спытаць працаўнікоў музея і дзеячаў Згуртавання „Музей і асяродак беларускай культуры" як яшчэ доўга гэты ўнікальны экспанат будзе стаяць на задворках музея. Яго ж месца павінна быць у экспазіцыі, прысвечанай апрацоўцы воўны або народнаму ткацтву. А пакуль да гэтага ваўначоску трэба неадкладна аддаць у рукі спецыялістаў па рэстаўрацыі экспанатаў.

Выстава Аксаны Гайдуковіч у Седльцах

Адам БОБРЫК

Фота Галіны БУДЗІШЭЎСКАЙ

У Рэгіянальным музеі ў Седльцах 10 снежня адбыўся вернісаж выставы жывапісу Аксаны Гайдуковіч. Працуе яна дацэнтам кафедры архітэктурнага праектавання і рысунку Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. Дзесяць гадоў з'яўляецца яна членам Беларускага саюза мастакоў. Малюе пейзажы, сімвалічныя кампазіцыі і нацюрморты. Удзельнічала ў шматлікіх мастацкіх пленэрах не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы, Нямеччыне і Францыі. У ліку яе дасягненняў — больш за сто выставак, ладжаных з 1992 года. У 2000 г. стала лаўрэаткай конкурсу ЮНЕСКА „Новыя імёны".

У Седльцах мастачка паказала больш за сорак карцін. Куратар выставы Данута Міхалец адзначыла, што карціны адлюстроўваюць шырокае кола зацікаўленняў мастачкі. Гледача асабліва захапляе радасная маляўнічасць і творчы размах. У шматлікіх карцінах паяўляюцца таксама рэлігійныя матывы, якія ачароўваюць сваім візантыйскім майстэрствам. Дырэктар музея Славамір Кардачук падкрэсліў, што гэта першая персанальная выстаўка мастачкі ў Седльцах, і выказаў спадзяванне, што па яе слядах пойдуць іншыя беларускія творцы, якія пакажуць свае працы ў музейных сценах.

Аксана Гайдуковіч сказала „Ніве", што для яе самым важным з'яўляецца не толькі тварэнне. Мастацтва дае вялікае задавальненне і магчымасць праяўляць свае эмоцыі. Вялікую ўвагу адводзіць яна папулярызацыі беларускага мастацтва. Удзел у міжнародных мастацкіх пленэрах, замежныя выстаўкі гэта дасканалы метад набліжэння свету беларускай культуры. У нас многа супольнага. Гэта вельмі добра ўплывае на супрацоўніцтва творцаў і ўзбагачвае яе, — адзначыла Аксана Гайдуковіч.

Вернісажу спадарожнічаў канцэрт калектыву Гарадскога асяродка культуры пад кіраўніцтвам Мацея Туркоўскага. Выстава працуе да 10 студзеня 2011 года.

Уладзімір СІДАРУК

Прытулак для падкідышаў

У пачатках 1990-х гадоў быў здадзены ў карыстанне шыкарны трохпавярховы будынак вакзала ў Чаромсе. Змяшчаліся тут адміністрацыйныя кабінеты чыгуначных служб і ўстаноў, якія з імі супрацоўнічалі: пагранічнай аховы, мытнага аддзялення, службы аховы чыгункі і пошты. Падарожныя карысталіся прасторнай залай чакання ды паслугамі добразабяспечанай прадуктовай крамы, якая межавала з білетнымі касамі. Але з ходам часу ідылія закончылася. Наступіў заняпад вузлавой станцыі. Па прычыне шматлікіх рэструктурызацый абмежаваліся штаты рабочага калектыву. З некалькіх соцень рабочых засталіся адзінкі. Кандуктараў і білетную касу Прадрыемства маёмасці вышвырнула ў прыватны будынак. Пагранічнікі перасяліліся ў новазбудаваную заставу. Адмовіўся ад арэнды ўладальнік прадуктовай крамы. Засталіся мытнікі, пошта і вартаўнікі службы аховы чыгункі ды пункт продажу вопраткі, які змяшчаецца ў зале чакання, якая адкрытая адно днём (у сем вечара яе закрываюць). Такім чынам большасць памяшканняў застаецца невыкарыстанымі. Уладальнік маёмасці шукае стратэгічнага інвестара, які купіў бы будынак станцыі, або заняўся яго добраўпарадкаваннем і адкрыў у ім бізнес. Для гэтай мэты сёлета былі заменены вокны ва ўсіх памяшканнях. Кошт інвестыцыі вялікі, але карысць мізэрная. Няма ахвотных заняцца ў Чаромсе бізнесам у чыгуначных памяшканнях. Каму затым яна служыць?

Нядаўна сустрэўся я з Раісай Баярунец, якая працуе ў кіёску з вопраткай. Непадалёк прадаўшчыцы прыкмеціў я невялічкага коціка, які спажываў з пластмасавай місачкі страву.

— Ды што ж гэта, коціка падкормліваеш? — з усмешкай кідаю ў бок сяброўкі.

— Падкінулі на станцыю, — заяўляе з сумам жанчына. — Трэба камусьці заняцца...

— Даўно займаешся кватарантам?

— Тыдзень будзе, — і тут жа дабаўляе, — не першы ён. Прынесеныя раней чатыры коцікі знаёмым перадала...

Вось, даражэнькія, да чаго дакаціліся. Чаромхаўскі вакзал, збудаваны коштам самаахвярнай працы чыгуначнікаў дзеля паляпшэння сацыяльных умоў іх працы, замест служыць грамадству стаў прытулкам для... бяздомнай жывёлы. І гэта мае быць чыгуначная рыначная эканоміка?

Юры Качук з жонкай Ліліяй (побач) і Янінай Чыжэўскай

Моц смаку Юры Качука

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

На першай старонцы кнігі „Беларуская кухня. Моц смаку" аўтарства Юры Качука чытаем словы „Памяці продкаў, дабрабыту сучаснікаў, шчасцю нашчадкаў".

Новае выданне, прыгожа ілюстраванае малюнкамі і здымкамі, змяшчае шматлікія рэцэпты, якія аўтар збіраў амаль дваццаць гадоў у родным мястэчку Зэльве і па ўсёй Беларусі, пераглянуўшы кухмаранне і ў гістарычным ракурсе. „Каб нарыхтаваць сапраўдную беларускую страву, трэба не толькі мець адпаведны настрой ды ахвоту, але і думаць па-свойму". На прамоцыі кнігі-альбома ў беластоцкай кавярні-кнігарні „Акцэнт" аўтар адзначыў:

— Калі думаеш па-беларуску, калі з беларускіх прадуктаў усё гэта гатуеш, тады і атрымаецца беларускай страва. Рэцэпты збіраліся і па Зэльве, і ў Наваградку. Шмат якіх рэцэптаў давялося мне адаптаваць са старадаўніх беларуска-ліцьвінскіх кніжак, адаптаваць да сучаснасці. Я люблю, калі і жонка на кухні дапамагае, я без памочнікаў не магу абысціся, каму ж даверыць цыбулю рэзаць...

Сродкі, атрыманыя ад распаўсюду кнігі „Беларуская кухня. Моц смаку", будуць выкарыстоўвацца дзеля ўпарадкавання месц масавых рэпрэсій у Курапатах. Пасля прэзентацыі выдання аўтар прапанаваў усім удзельнікам імпрэзы пачастунак — наліўку ды селядзец, прыгатаваны яго супрацоўніцай і сяброўкай з Беласточчыны, аніматаркай культуры Янінай Чыжэўскай, раднай Гарадской рады Беластока. Гэта ўжо другое выданне аўтара, прысвечанае кулінарыі. Першае — „Традыцыйныя стравы Гродзеншчыны і Беласточчыны" выйшла ў сааўтарстве з Янінай Чыжэўскай. Другая кніга выйшла ў Беластоку ў выдавецтве „Ортдрук".

Юры Качук нарадзіўся 17 лютага 1963 года ў мястэчку Зэльва на Гарадзеншчыне. Мама: Людміла (24.12.1944-17.08.2002); тата: Міхаіл (8.07.1939-18.07.1995). Адукацыя: Беларускі політэхнічны інстытут у 1985 годзе, інжынер па эксплуатацыі аўтамабільнага транспарту, Факультэт грамадскіх прафесій — аддзяленне „Журналістыка" пры Беларускім політэхнічным інстытуце ў 1982 годзе, ваенная кафедра Беларускага політэхнічнага інстытута — афіцэр, ваенны інжынер, Школа „Пагранічча" (Сейны, Польшча) у 2000 годзе, аніматар. Працаваў: старэйшым інжынерам-тэхнолагам, начальнікам аўтакалоны, старэйшым супрацоўнікам Цэнтра навучання пажарнай бяспекі. Выдае: вучнёўска-бацькоўска-настаўніцкую газету „Зяльвяначка" з 25 жніўня 2000 года, аніматарскае выданне Зэльвеншчыны „БэЗ" (Беларуская энцыклапедыя Зэльвеншчыны) з 25 снежня 2001 года. Аўтар шматлікіх артыкулаў, вершаў, нарысаў, эсэ, апавяданняў, навел, аповесцей. Напісаў сцэнарыі і зняў дакументальныя фільмы: „Замілаванне" (1998 год), „Васілёва званіца" (2005 год, у сааўтарстве з Сяргеем Печарыцам). Жанаты з 23 лістапада 1985 года, жонка Лілія, настаўніца матэматыкі, дачка Юлія (21 год), студэнтка Карлавага ўніверсітэта (Прага, Чэхія). Мае ката Веню. Захапленні: уласная некалькітысячная бібліятэка, мастацтва (асабліва жывапіс), гісторыя, філасофія (хрысціянскі экзістэнцыялізм), кінематограф, кулінарыя, паэзія, камп'ютарная графіка, філатэлія, картаграфія, музыка. Любімыя пісьменнікі: Генрык Сянкевіч, Аляксандр Дзюма; кнігі: Біблія, „Патоп" Генрыка Сянкевіча, „Графіня дэ Мансаро" Аляксандра Дзюма, усе кнігі Віктара Суворава (акрамя „Кантроль" і „Выбар"); мысляр: Фрыдрых Ніцшэ; паэты: Рыгор Барадулін, Шарль Бадлер, Іосіф Бродскі; палітыкі: Станіслаў Булак-Балаховіч, Зянон Пазьняк.

Прапануе м.інш. адмысловыя стравы:

Языкі ў вушах:

Свіныя языкі адварваюцца ў салёнай вадзе да мяккасці. Асобна варацца свіныя вушы, але самае галоўнае, каб храшчы былі мяккія. Натаўчы часнаку, кропу, пятрушкі, перцу. Гэтым націраем вараныя языкі. Рэжам языкі па памерах вушэй і заварочваем у іх. Кладзем шчыльна адзін каля аднаго на плоскую міску, другой плоскай міскай накрываем зверху, прыціскаем і кладзем груз. Выносім у холад, каб добра застылі. Потым рэжам як кілбасу. (Рэцэпт атрыманы ад Юркавай бабулі Надзеі Ленец, якая ў свой час атрымала яго ад сваёй мамы Тэафілі, па расповедах якой гэтая страва была самай любімай яго прапрапрадзеда Казіміра Ленца).

Гарбузок:

1 невялікі малады гарбуз, 2 цыбуліны, 1,25 л вады, 0,5 л сыроваткі, 150 г вяндліны (або мяса), 50 г сала, 0,5 шклянкі смятаны, 1 пятрушка, 3 сталовыя лыжкі кропу, 0,5 ст. лыжкі каляндры.

У вадзе адварыць вяндліну, калі закіпіць, пасаліць і дадаць частку цыбулі. Гарбуз нарэзаць дробнымі кубікамі, засыпаць у булён, варыць на марудным агні да гатоўнасці гарбуза, заправіць салам, падсмажаным злёгку з цыбуляй, заліць сыроваткі, даць закіпець, дадаць прыправы, заліць смятанаю. Даць пастаяць пад вечкам 10 хвілін.

Мачанка вяндлінная:

Мачанку вяндлінную рыхтуюць звычайна з разнастайных мясных вырабаў — вэнджаных, напаўвэнджаных, салёных: са свінога сала, бекону, вяндліны, бачка, вэнджанай карэйкі, свіной вэнджанай каўбасы і т.п. Як правіла, на мачанку ідуць абцінкі гэтых прадуктаў, астатнія пасля падрыхтоўкі іншых страў, і асабліва абцінкі з костак, якія нельга выкарыстаць інакш. Таму нават тады, калі выкарыстаюць цэлыя прадукты, мяса ў мачанку нарэзваюць вельмі дробна — маленькімі кавалачкамі, дробнымі кубікамі або тонкай саломкаю. Астатнія кампаненты мачанкі — топленае сала, мука і вада. А з прысмаку, г.зн. прыпраўных дадаткаў, — цыбуля, грыбы, кроп, радзей перац і маяран. Калі мачанку рыхтуюць як самастойную страву, то дазваляецца ўводзіць у яе закалоты — бульб ы, капусты, рэпы. У гэтым выпадку гародніну спачатку адварваюць прыпусканнем, а затым у дробна парэзаным выглядзе дадаюць да гарачай мачанкі. Закалоты можна падаваць да мачанкі цалкам асобна. У гэтым выпадку гародніна можа быць печанай, смажанай, а не толькі варанай, і падаюць іх цэлымі або буйнымі кавалкамі, палітымі часам таплёным тлушчам або алеем. У гліняны саган укрышыць вяндліну і сала дробнымі кубікамі, пакласці топлены тлушч, дробна парэзаную цыбулю і, шчыльна зачыніўшы (можна пад лютам), паставіць на 15 хвілін у духоўку на слабы агонь. Затым выняць, засыпаць грыбы, прыправы, заліць цёплай вадою, у якой папярэдне распушчана мука, добра размяшаць змесціва сагана і ізноў паставіць у духоўку з сярэднім жарам на 25 хвілін. Пасля гэтага выняць, пераліць у рондаль і, увесь час памешваючы, дагатаваць на пліце на слабым агні яшчэ некалькі хвілін, імкнучыся, каб поліўка мачанкі мела кансістэнцыю вадкага кісялю, у адваротным выпадку дадаць трохі мукі і працягваць варыць яшчэ 5 хвілін. Сыць Божа!

Як чытаюць „Ніву"

З цікаўнасю чытаю я допісы ў „Ніве" спадара Янкі Целушэцкага як былога штатнага працаўніка „Нівы", а цяпер актыўнага карэспандэнта. Паказваў ён як павялічваецца лік нашых чтачоў у Нараўчанскай гміне. І гэта мяне вельмі цешыць. Але не ў гэтым справа. Мне прыгадаліся сямідзесятыя і васьмідзесятыя гады XX стагоддзя, калі рэдакцыя „Нівы" аб'яўляла конкурсы для пісьманосцаў на падапіску „Нівы". Пераважна пераможцам з'яўляўся наш актыўны карэспандэнт і лістаноша спадар Мікалай Панфілюк з Дубіч-Царкоўных. Ён тады ў кожную пятніцу ў сваёй сумцы меў па 200 і больш экземпляраў „Нівы". Таксама ў тым часе на пошце ў Трасцянцы Нарваўскай гміны працавалі два пісьманосцы Мікалай Паланкевіч і Уладзімір Андраюк. Валодзя прымаў удзел у конкурсе на распаўсюджванне „Нівы" і заваёўваў II і III месцы, возячы ў сваёй сумцы па 100 і больш экземпляраў „Нівы" ў кожную пятніцу. Адышоў Мікалай Панфілюк на пенсію, парваў блізкія сувязі з „Нівай". Цікава, як цяпер чытачы чытаюць „Ніву" вакол Дубіч-Царкоўных. Можа, адгукнецца наш сябра і былы карэспандэнт? Адышоў на пенсію Уладзімір Андраюк з пошты ў Трасцянцы, а яго месца заняў Віктар Селеванюк. Калі ліквідавалі пошту ў Трасцянцы, Віктар перайшоў на працу на пошту ў Нарве і працуе там да сёння. Калісь у Трасцянцы было лістаношаў двух, а цяпер адзін абслугоўвае вёскі Трасцянку, Бялкі, Сацы, Пухлы, Анцуты, Рагазы, Іванкі, Сакі, Агароднікі ды Гозну ў Міхалоўскай гміне. У гэтых вёсках 70% насельніцтва гэта праваласўныя, ды калі я спытаўся ў пісьманосца, колькі ён цяпер развозіць „Нівы" ў тыдзень, адказаў, што толькі тры штукі! Гэта значыць „Ніву" прыносіць ён мне, Галене Тапалянскай і ў бібліятэку ў Трасцянцы. Што здарылася з нашымі людзьмі? Ці яны сталі такія бедныя, ці мо пісьманосцы не хочуць рабіць падпіскі? А можа „Ніва" перастала быць такой цікавай?.. На маю думку, гэта людзям не хочацца чытаць. Сорамна, нам, беларусам, што такім чынам забываемся пра роднае слова!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Гданьск, 20 снежня 2010 г.

Мы, беларусы, пражываючыя ў Трыгарадзе, вельмі занепакоеныя ўчарашнімі (у дзень прэзідэнцкіх выбараў) падзеямі ў Беларусі. Рашуча пратэстуем супраць актаў гвалту ўлады над незалежнымі кандыдатамі на прэзідэнта ды над народам, які адважна выйшаў на плошчу, каб паказаць свае адмоўныя адносіны да рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Народ запалохаць можна, але нельга яму адбіраць волі выказвання сваёй думкі. Дамагаемся выпусціць на волю ўсіх затрыманых ды правесці дэмакратычныя прэзідэнцкія выбары, без здзеку над беларускім грамадствам.

Жыве Беларусь!

Праўленне Беларускага культурнага таварыства „Хатка" ў Гданьску

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота Ганны Кандрацюк

Гісторыі, якія жывуць у кожным з нас

У жыцці ўсё з усім сутракаецца, пераклікаецца, дапаўняецца.

— Мы таксама падумалі, каб не адчыняць ужо адчыненых варот, — кажа Аліна Ваўранюк, апякун праекта, аўтар сцэнарыя і рэжысёр спектакля *Ой, даўно, даўно...* Спектакль мае другі падзагаловак, які сам па сабе тлумачыць усё: *Беларускія гісторыі з Падляшша.* Пастаноўка ўзнікла пад уплывам „Сейненскіх хронік", якія цягам многіх ужо гадоў паказвае моладзь з Сейнаў, аб'яднаная вакол асяродка „Пагранічча". Ідучы на спектакль у беластоцкую „чацвёрку", я была цікавая наколькі *Беларускія гісторыі з Падляшша* будуць напамінаць сейненскі ўзор. Пачатак пастаноўкі здаўся цяжкім: замнога ў ім дэталяў пра родавыя адгалінаванні. Пасля, калі маладыя акцёркі і акцёры сталі распавядаць паасобныя гісторыі сваіх бабуль і дзядуляў, усё перамянілася. Сямейныя гісторыі гучэлі кранальна, праўдзіва, займальна. Разам з імі глядач пабываў у знаёмых мясцінах, такіх як Відава, Елянка, Чыжы, Рэпіскі, Тыневічы, Бельск, Доўгі Брод. Невыпадкова нас завуць народам сваякоў — на Падляшшы ўсе з усімі (далейшыя або блізкія) сваякі.

Пераказ вёўся на дыялекце вёсак. Калі выступала Кася Бялькевіч, то адразу адчуваўся смак чыжоўскай гаворкі, з яе пачуццём гумару, характэрнай вольным вёскам. У Даркі Вапы адбілася адвага і вынаходлівасць пушчанскіх людзей, калі ад гоману і песні „падымалася" вуліца ў Елянцы. Лідка Пякарская распавяла пра трагічныя здарэнні 1946 года, калі частка яе сям'і пацярпела ад польскага падполля. Не менш кранальны атрымаўся расказ Ігара Карнілюка пра смерць сваячкі-яўрэйкі, якую разам з трыма дзеткамі расстралялі фашысты. Запамятаўся таксама расповед пра тэатр у Відаве, які тамтэйшая моладзь наладзіла ў стадоле Олінай бабулі. У сцэнарыі як у жыцці — жахі вайны і бежанства перапляталіся з атмасферай забавы і гульняў, неразлучнай маладым. Настрой будавала таксама песня „Ой даўно-даўно", сугучная выносліваму характару падляшоў. Уражвала таксама сцэнічнае афармленне і сціпласць сродкаў, якія адлюстроўвалі наш жыццёвы мінімалізм. Ад спектакля ў мяне засталося адно ўражанне: гэта найбольш вартасны, спелы і прыгожы спектакль пад кірункам Аліны Ваўранюк. Праца над ім доўжылася два гады і трэба спадзявацца, што, так як „Сейненскія хронікі", будзе мець свой працяг. Абавязкова трэба паказаць яго ўсім нашым гімназістам і ліцэістам, каб пацікавіліся сваімі каранямі, бо з гэтага пачынаецца чалавек і яго гісторыя, гісторыя якая жыве ў кожным з нас. Нам прыемна адзначыць, што сейненскі асяродак „Пагранічча" паспрыяў таксама іншай ідэі на нашым панадворку — гутарка ідзе пра Сустрэчы „Зоркі" якія пачаліся ў 1995 годзе і мелі ўжо свае 24 выпускі.

ЗОРКА

Магдаліна Панасюк

Ёсць дзве Магды Панасюк — адна з Комплексу школ з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім, якая ў конкурсе «Пазнай Беларусь» ва ўзроставай катэгорыі 13-15 гадоў апынулася на першым месцы, і другая — Магдаліна Панасюк з белгімназіі з Гайнаўскага комплексу школ з беларускай мовай навучання. А гэтая Магда — удзельніца Сустрэч «Зоркі» ды агульнапольскіх конкурсаў беларускай паэзіі і прозы. Сёлета, у XIII конкурсе, прынялі ўдзел толькі дзве гімназісткі. Магда Панасюк у мінулагоднім конкурсе атрымала ўзнагароду за свае вершы. Сёлета яе творы былі яшчэ больш спелыя па форме і змесце. Ды што ж — чамусь малавата тэкстаў даслалі на конкурс наймалодшыя ўдзельнікі... І вылучэнняў камісія ніякіх не дала. Ну так, час ад часу паэтаў трэба ці падагнаць, ці дапільнаваць — каб узялі напісанае сабою ды выслалі на конкурс. Так было раней і з Магдай — калі б не заахвоцілі, дык ніхто не ведаў бы, што Магда Панасюк — паэтэса. І журналістка, як пасля аказалася на майстар-класах на Сустрэчах «Зоркі», а нават — рэдактар! Ці пойдзе далей у гэтым напрамку — невядома. На конкурс прыслала свае творы адна былая ліцэістка з Гайнаўскага белліцэя і алімпійка па беларускай мове, якая таксама гасцявала ў «Зорцы» — Мартына Леанеўская, якая цяпер студэнтка III курса... ветэрынарыі! Можна ўсё выказаць на роднай мове — перш за ўсё пачуцці.

Фота Ганны Кандрацюк

А пра што піша Магда? Прачытайце!

Міра ЛУКША

Магдаліна ПАНАСЮК

гэта ўсё

сплеценыя рукі
галава пры галаве
нага пры назе
і ідуць праз свет

ідуць без канца
ідуць безупынку
без павароту
і нясуць свой свет

нясуць гэта ўсё
да чаго дайшлі
і што разам стварылі
бо такі іх лёс

лёс
які выбраў
якраз іх
і гэта ўсё ім даў

у іншым вымярэнні

а калі б так
успырхнуць да неба
убачыць свет як
згары выглядае
паглядзець на ўсё
што нам цяжкае
паслухаць крыкаў
размоваў малітваў
пачуць гэтае дрыжанне
але ў іншым вымярэнні

і ляжаць так на хмарцы
колькі ўдасца і можна
бо тут ёсць цудоўна
спакойна цёпла
тут не тое што там
дзе бяжыш каб паспець
каб ніхто не плюнуў
у твой твар

ляжаць ляжаць і ляжаць
так у непрысутнасці
але духам з усім
не думаць?
хіба не ўдасца...
але прабаваць
прабаваць
прабаваць
і ляжаць
і слухаць
і глядзець

Геракл знішчае Лярнейскую гідру

Старажытнагрэцкі міф

Непадалёку ад Аргоса распасціралася вялікае Лярнейскае балота. Чыстая і светлая крынічка выцякала тут з-пад зямлі, ды слабы ручаёк не мог прабіцца да ракі або мора і разліваўся наўкол у нізіне. Вада застойвалася, зарастала мохам і балотнымі травамі, і вялізная даліна ператварылася ў балота. Яркая зеляніна, што заўсёды ўкрывала балота, вабіла да сябе стомленага падарожніка, але як толькі ён ступаў на зялёны лужок, з сыканнем і свістам выпаўзала з дрыгвы дзевяцігаловая пачвара — гідра. Яна абвівалася сваім змяіным хвастом вакол чалавека, зацягвала ў балота і прагна з'ядала.

Увечары, калі гідра, наеўшыся, засынала, ядавітае дыханне яе дзевяці пашчаў ахутвала туманам балота і атручвала паветра. Той, хто дыхаў гэтым паветрам, занядужваў, доўга хварэў і паміраў. Таму людзі баяліся набліжацца да балота і сяліцца каля гэтай страшнай мясціны.

І вось цар Еўрысфей загадаў Гераклу знішчыць Лярнейскую гідру.

Геракл выправіўся ў Лерну на калясніцы, якой кіраваў яго сябар Іялай. Калі яны даехалі да балота, Геракл пакінуў Іялая з калясніцай каля дарогі, а сам запаліў паходню і смела рушыў на балота.

Гідра тым часам была сытая і драмала. Геракл пачаў падпальваць канцы стрэл паходняй і пускаць іх у гідру. Расцвяліўшы гідру, ён прымусіў яе выпаўзці з балота. Халодным слізкім хвастом яна абвіла левую нагу Геракла, і ўсе дзевяць галоў засіпелі вакол яго. Геракл шчыльней захутаўся ў ільвіную шкуру якая надзейна ахоўвала яго ад звярыных зубоў і змяінага джала, дастаў меч і пачаў сячы адну за адной страшныя галовы гідры.

Але як толькі сцякала з раны чорная кроў, на месцы адсечанай галавы вырасталі дзве іншыя, яшчэ больш злосныя, яшчэ страшнейшыя. Неўзабаве Геракла акружалі, быццам жывы куст, сіпучыя галовы, і ўсе яны цягнуліся да яго, разяўляючы крывавыя пашчы.

Ён не мог скрануцца з месца — нага яго была ў кальцы змяінага хваста, рука стамілася сячы ўсё новыя і новыя галовы гідры. Раптам ён адчуў боль у левай назе і, нахіліўшыся, убачыў рака, які клюшняй учапіўся ў яго пятку.

Геракл засмяяўся:

— Двое супраць аднаго? Гэта несумленна! Бой няроўны. Цяпер і я маю права паклікаць сябра на падмогу!

І ён паклікаў Іялая, які чакаў яго ля калясніцы.

Геракл аддаў яму паходню і загадаў паліць агнём рану, як толькі меч адсячэ галаву гідры. І там, дзе пёк агонь, ужо не вырасталі новыя галовы. Неўзабаве апошняя галава гідры пакацілася ў балота. Але яна не хацела паміраць нават пасля таго, як была адсечана, і, лежачы на траве ў крыві, зыркала злоснымі вачамі і раз'юшана разяўляла пашчу. Гераклу давялося вынесці яе з балота і закапаць у зямлю, каб яна не нарабіла каму шкоды.

У чорнай крыві Лярнейскай гідры Геракл намачыў канцы сваіх стрэл, і яны сталі смяртэльнымі — нішто не магло вылечыць таго, у каго пацэліла такая страла.

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Мартына Швед (V „д" клас Комплексу школ з беларускай мовай навучання № 3 у Бельску-Падляшскім).

2. Твой любімы прадмет: прырода і беларуская мова.

3. У жыцці хачу стаць: ветэрынарам.

4. У сяброў цаню: дабрыню, шчырасць.

5. Не люблю: людзей, якія здзекуюцца над жывінкамі і звярамі, не люблю таксама эгаістаў.

6. Па-беларуску размаўляю: з бабулямі, дзядамі і мамай.

7. Кніжка, якая цябе захапіла: „Хронікі Нарніі" Клайва Стэйплза Льюіса.

8. Падабаецца табе музыка: поп-музыка.

9. Твае ўлюбёныя стравы: спагеці.

10. Твой любімы спосаб адпачынку: люблю чытаць кніжкі.

11. Калі дарасту хачу жыць: у Варшаве, бо там жыве мая хросная мама, якую люблю і часта наведваю.

Анатоль ПАРЭМБСКІ

Сланечнікі

Сланечнікі, сланечнікі,
сонцу роўныя красою.
Шлюць паклоны вам музыкі
і з адкрытаю душою.
Сонца прамень дзе іскрыцца,
зямлі шчасце астаўляе
і з адбітка сонца ліца
цуд-сланечнік вырастае.
Сланечнікі, сланечнікі
з сонца трапілі на зямлю,
з вамі быць — абсяг вялікі,
а быць з вамі — не задрэмлеш.
Хіляцца за сонца следам,
нібы дочанька за мамай,
навакол заносіць мёдам,
як бы міламу каханай.
Сланечнікі, сланечнікі,
весела жывецца з вамі,
а падказваюць навыкі,
што навекі мы сябрамі.
Хочацца туліць вас к сэрцу,
як каханую дзяўчыну,
і любіць, любіць бязмерна
і ніколі не пакінуць.

Музыка з кайфам

Французскія шансоны

На сталах індыкі і каштаны, гусі ды бліны. Замест ёлкі — батлейка. Тым, між іншым, Божае Нараджэнне характэрнае Францыі. Ці хаця б раз нехта з вас марыў паехаць у Парыж? У эпоху танных пралётаў гэтую мару лёгка здзейсніць, але, зразумела, трэба спачатку дасягнуць пэўнага ўзросту, самастойнасці, незалежнасці. Калі смачнымі для вас здаюцца парыжскія пейзажы, пахі, алеі, можна, напрыклад, зазірнуць у інтэрнэт або... час ад часу паслухаць беларускай музыкі. Ёсць у Беларусі прыхільнікі французскай культуры.

Сваёй сімпатыі для французскай музыкі і мовы ўжо пару гадоў не хавае Зміцер Вайцюшкевіч. Гэта ён, рыхтуючы кавер на песню гурту „Нейра Дзюбель" з дапамогай сяброўкі падрыхтаваў французска-моўную версію песні „Резиновый дом". Песня гучыць фантастычна, набрала лёгкасці і зусім новага характару, а сам Вайцюшкевіч так палюбіў з узаемнасцю Францыю, што ўжо неаднойчы канцэртаваў у гэтай краіне. Першы найменшы канцэрт свету ў Францыі мае за сабой таксама і Лявон Вольскі (на здымку). Найменшы таму, што публікай былі пэўна турысты, якія падымаліся на самы верх Эйфелевай вежы ў час, калі Лявон складаў пад носам чарговыя радкі сваёй апошняй песні. Па-французску! Вакаліст прызнаўся пры нагодзе прамоцыі ўзніклай песні, што вывучаў у школе французскую мову і якраз апошняя паездка ў Парыж натхніла яго вярнуцца да амаль забытай мовы. Відаць, моўны талент у яго ёсць, бо ўспомніць словы, фразы ці сказы ў час вулічных гутарак не вялікая штука, але зразу складаць словы песні! Калі Лявон Вольскі, памыліўшы чэргі да славутай вежы, прымушаны быў не на ліфце, але пешшу падымацца ўверх, меў шмат часу на новыя мастацкія думкі. Так узнікла песня „Vive le Matain!". Што цікава, пасля вяртання ў Беларусь зразу паўстаў яе беларускамоўны варыянт „Хай будзе дзень!". Песня напэўна прынясе вам надзею на пацяпленне надвор'я, настрою ды новыя музычныя ўражанні на святочна-навагодні час!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 1

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 49:

Як, сала, тлум, брат, салатка, палена, кіно, ты, нок, замак, кіт. Фота, вяз, гусак, маліна, лянок, збанок, карта, лак, натарыят.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Дамініка Асташэўская, Паўліна Паплаўская, Юстына Данільчук, Мартына Швед, Дыяна Галёнка, Патрык Сасна, Клаўдзія Дарашкевіч** з Бельска-Падляшскага, **Дарота Артышук, Эмілька Сцепанюк** з Гайнаўкі. Віншуем!



ПРАЖЫЦЬ ТРЫ ЖЫЦЦІ

Размова з ***Касяй Бондай*** *— пісьменніцай, журналісткай, выпускніцай Гайнаўскага белліцэя*

Кацярына Бонда — *нарадзілася ў 1977 г. у Гайнаўцы, выпускніца Гайнаўскага беларускага ліцэя, абітурыентка факультэта журналістыкі Варшаўскага ўніверсітэта, аўтарка раманаў і дакументальных кніжак: „Sprawa Niny Frank" (2007), „Polskie morderczynie" (2008), „Zbrodnia niedoskonała" (2009), „Tylko matrwi nie kłamią" (2010), сааўтарка дакументальнага фільма на аснове сваёй творчасці „Życie za śmierć", у 1996-2009 гадах працавала, між іншым, журналісткай штодзённак „Kurier Podlaski", „Express Wieczorny", „Super Express", штотыднёвікаў „Naj", „Newsweek", „Wprost", штомесячніка „Zdrowie", працавала таксама на Польскім тэлебачанні няштатным супрацоўнікам, зараз — студэнтка II курса сцэнарнага мастацтва Дзяржаўнай вышэйшай фільмавай і тэлевізійнай школы ў Лодзі.*

— Першая была Ніна Франк ці Ніна-дачка?

— Ніна Франк гэта гераіня маёй першай кніжкі. Але я ўвогуле закаханая ў гэтае імя. У нашай сям'і так склалася, што жанчыны наперамен атрымліваюць імёны Ніна і Кацярына. Усё тады было ясна.

— Калі паўставала Твая першая кніжка, Ты паддалася самагіпнозу. Навошта?

— Патрэбны быў, каб дакрануцца да найбольш балючых тэм, скрываных эмоцый. Перад самім гіпнозам найважнейшай была гераіня кніжкі, а калі працэс закончыўся, я ўжо мела гатовы персанаж. Не толькі спісак рыс, але цэлую постаць. Пасля яна ўжо сама вяла мяне праз кніжку. Можа гэта выглядае як шаленства, але для стварэння клімату рамана мне патрэбная была своеасаблівая магія, спроба балансаваць на грані рэальнасці. Для гэтага трэба герояў прапускаць праз сябе, у тым ліку ўсе жахі і сарамлівыя эмоцыі. Было ясна, што падзеі першай кніжкі разгортвацца будуць на Падляшшы. Але хацелася стварыць свет напалову прэсны, свойскі — знешні ды таямнічы, крыху змрочны — ад сярэдзіны.

— Ці ўраджэнку Гайнаўкі звязвае з родным горадам нейкая пупавіна?

— Маю вялікі сентымент. Першая кніжка не без прычыны звязана з Падляшшам. Носіш яе глыбока ўсярэдзіне і нечакана прыходзіць яна на свет. Кніжка ў той час была лякарствам на складаную сітуацыю. Вельмі цяжка, па начах, працавала я ў тыднёвіку „Newsweek", а кожныя выхадныя ездзіла да бацькі, які паміраў ад рака. Пазнавала тады лепш Такары, вёску, дзе бацька купіў жытло, і там пасля вырашыла памясціць падзеі кніжкі. А Гайнаўка? Гэта краіна шчаслівасці, дзяцінства, дзе ўсё тваё, месціцца ў кішэні. Цяпер, калі там прыязджаю, адчуваю расчараванне. Пах бяды, беспрацоўя. Гэта горад, якіх я, як рэпарцёр, наведвала дзесяткі разоў, таму першае ўражанне — непрыемнае. Хацела я крыху вярнуць сабе гэтую Гайнаўку і нават старалася аднавіць старыя знаёмствы, але беспаспяхова.

— Ці Ты думала, што выязджаеш з Гайнаўкі назаўсёды?

— Не, маёй мэтай было перш за ўсё дасягнуць у жыцці чагосьці. Не хацела я пакідаць сваёй бацькаўшчыны, але запланавала стаць журналістам. Па-шчырасці, хацела стаць пісьменніцай, але тады ў духоўным сэнсе была я яшчэ малая, а малыя людзі пішуць наіўна. Разумела, што трэба спярша вучыцца. Рэдка бывае, што здараецца нехта малады, геніяльны як, напрыклад, Дарота Маслоўская, якая гуляе формай, спецыфічна глядзіць на свет. Ну, і яна не з Гайнаўкі (*смех*). Я не была так спелая, але, дзякуючы журналістыцы, мне прыйшлося ўжо перажыць прынамсі тры жыцці. Сотні людзей і пазнаных месц у Польшчы ды ў свеце дазволілі правяраць сябе і тое, што я вынесла са свайго роднага месца, якое лічу важнай базай. Гэта мяне абумоўлівае.

— Што засталося ў Табе з правінцыйнасці?

— Вельмі люблю суседскую блізкасць. Цікавяць мяне малыя рэчы і дробныя справы. Вялікая палітыка ці гісторыя — не для мяне, гэта хутчэй мяне трывожыць. Нават тое, што жыву ў цэнтры Варшавы, з'яўляецца доказам важнасці месца дзяцінства і юнацтва. Мне трэба, каб усюды было блізка, так як у Гайнаўцы. Натуральна, спачатку былі ў мяне комплексы, я зусім не ўмела апранацца. Праца з людзьмі ў сталіцы прымусіла гэта выправіць. Калі ты з малога гарадка, безумоўна, табе цяжэй, стартуеш з іншага ўзроўню. Калісьці я шмат іграла на піяніна, але не было магчымасці адукавацца ў гэтай галіне. Вельмі многа я чытала, але кніжкі выбірала наўдачу. Зараз з маёй трохгадовай Нінай ходзім рэгулярна ў тэатр, а ў маім дзяцінстве тэатр быў заўсёды адлеглай і рэдкай экскурсіяй. У вялікім свеце трэба больш стойкасці, самакрытыцызму. Мне дапамагло тое, што я ніколі не саромелася. Калісьці мяне заўсёды пыталі ці Гайнаўка ляжыць у горах. Адчувала я сябе даволі экзатычна, а калі яшчэ дадаць, што я — праваслаўная, выпускніца беларускага ліцэя... Самыя плюсы. Увогуле лічу цудоўным перыяд вучобы ў белліцэі. Нягледзячы на тое, што паступіла я ў ліцэй без ведання мовы, алфавіта, якога-небудзь уяўлення пра гісторыю. Пачаткова адчувала я сябе адчужанай. Мае сябры моцна атаясамліваліся з беларускасцю, а я хутчэй была сярод іх госцем. З часам беларуская культура пачала мяне цікавіць як з'ява. Чытала я ўсю беларускую літаратуру, якую нам загадалі. Нават два дэтэктывы прачытала. Адзін маю да сёння.

— Як Ты ўвайшла ў журналістыку?

— Ужо ў трэцім класе я пісала ў гайнаўскі „Гасцінец". У чацвёртым супрацоўнічала з „Падляшскім кур'ерам". Заехала ў рэдакцыю і сказала: „Мяне завуць Кася Бонда. Хачу пісаць". Загадалі напісаць нейкі тэкст. Я нават не ведала як гэта зрабіць. Патрабавалі нейкі ньюс. Якраз закрывалі завод „Хімічна" ў Гайнаўцы. Пайшла я да дырэктара, які, відаць, мяне праігнараваў. Сказаў, што няшмат дзеецца, але трэба будзе звальняць людзей. Я ўсё напісала, тэкст паказаўся наступнага дня, пра што даведалася з прэсы. Дырэктар патэлефанаваў маёй маме, была афёра, але рэдакцыя запрапанавала супрацоўніцтва. У сваёй дарослай працы бывала, што спасылалася я на беларускія аспекты Гайнаўкі. Пісала, напрыклад, рэпартаж пра сяброўак, якія паступілі ў навучальныя ўстановы ў Беларусі.

— З журналісцкага аб'ектывізму Ты перайшла аднак у свет сваіх гісторый.

— Нічога не ўмею рабіць акрамя пісання. Можа штосьці яшчэ змагу зварыць, але больш абсалютна нічога. Журналістыкі ў пэўным моманце мне было недастаткова. Я маю ў сабе патрэбу місіянерства, якую журналістыка дазваляла рэалізаваць, таму пасля першай кніжкі яшчэ доўга працавала ў гэтай прафесіі. Але з часам, ці то ў газеце, ці ў тэлебачанні, пачалі ад мяне патрабаваць ньюсаў, „гамбургераў" як іх называем. Месца для рэпартажу ставала штораз менш і менш. Тады я зразумела, што дасягнула ў гэтай галіне столькі, колькі запланавала. Трэба было ісці далей. А я заўсёды хацела пісаць.

— Усё ж такі рэпартаж застаецца асновай Тваёй творчасці.

— Лягчэй мне адбіцца ад рэчаіснасці. Часам гэта абмяжоўвае і нервуе. Перш за ўсё тое, што ўсё мушу падрабязна правяраць, ці пішу кніжку, ці сцэнарый. Гэта такая журналісцкая хвароба. Некаторыя пераносяцца ў краіну фантазій і наперад, а я так да канца не магу.

— Але дэталёвасць хіба дапамагае Табе ствараць дасканалыя дэтэктывы...

— Пэўна так, тым больш што гэтая тэматыка са мной ужо шмат гадоў. Зараз аднак адчуваю ўжо яе цяжар. Нялёгка вызваліцца ад дэтэктываў. Мяне не цікавіць труп. Ён пазбаўлены эстэтыкі. Мяне цікавіць пераход з яснасці ў цемру і наадварот. Свет накручваюць дзве сілы — дабро і зло. Нараджаемся добрымі, злымі становімся. Па якіх прычынах і як — гэта мая тэматыка. Больш у тым псіхалогіі чым крыміналу. Не маю амбіцый тлумачыць свет ці будаваць візіі, бо і не адчуваю сябе вялікім інтэлектуалам. Знайшла я сабе месца дзесьці ў галіне дэтэктываў, бо люблю інтрыгу і будаванне таямніцы, канструяванне загадак. А калі пісаць, дык пра тое, што ведаеш і разумееш. Таму падзеі першай кніжкі адбываюцца на Падляшшы. Зараз ведаю таксама, чаму гераіняй стала жанчына, бо мне лягчэй было распавядаць пра жанчыну.

— У кнізе „Polskie morderczynie" не ствараеш гісторый, толькі разблытваеш загадкі.

— Гэта дакумент, а для мяне пісанне дакументаў — простая справа, нягледзячы на тое, што праца над кніжкай значна паўплывала на маю псіхіку. Я працавала ў стане апантанасці... люблю гэты стан... Шмат разоў я думала, што гэта ўжо вышэй маіх магчымасцей, але не здавалася.Тэма жанчын-забойцаў была мне блізкая, бо раней я працавала судовым карэспандэнтам і ўсе справы, усіх жанчын ведала я з апошніх 8-9 гадоў. Нават тады прапанавалі мне пісаць кніжку, але я была маладая і ведаю, што кніжка распавядала б пра бестый. Пазней я вярнулася да гэтай тэмы. Тады ўжо трэба было поўнасцю ўвайсці ў свет жанчын, якія ўчынілі забойства. Яны дапусцілі мяне да пэўнай таямніцы і ад гэтага нельга было вызваліцца. Канфрантуючы іх расказы з судовымі дакументамі, шукала я зерня зла, нейкага гена, гэтага, чаго шукаю, пішучы чарговыя кніжкі.

Канчаючы дакументацыю, была я напрыканцы цяжарнасці і калі праглядала акты судовых спраў, ужо пасля гутарак з паасобнымі жанчынамі, працаўнікі судоў напэўна думалі пра мяне як пра вар'ятку.

— Ты першая ў Польшчы распавядаеш аб працы паліцыйнага прафайлера. Той канкрэтны называецца Багдан Лях, у Тваіх кніжках гэта Губерт Мэер.

— Ён мяне сапраўды захапляе. З дэталяў умее скласці адказ, разблытаць загадку. Я, на жаль, так не ўмею. Калі я яго пазнала, пачала з артыкула ў сваім часопісе. Пасля напісала першую кніжку, выкарыстоўваючы асобу паліцыйнага прафайлера і з дрыжачым сэрцам прапанавала Багдану прачытаць яе. Прачытаў і сказаў сапраўды шмат добрых слоў. Аднак пачаткі нашага супрацоўніцтва былі складаныя. Ён не хацеў абсалютна нічога сказаць. Прайшло пару гадоў і ўдалося напісаць супольную кніжку. Гэта доказ маёй эфектыўнасці (*смех*).

— Ці чалавек, які пражыў тры жыцці, мае яшчэ аб чым марыць?

— Зараз пішу кніжкі, сцэнарыі, ужо закончаны серыял на аснове кніжкі, які зараз прабуем прадаць. Да гэтага пару раскапаных дакументацый. Мару, каб паспець усё зрэалізаваць, і яшчэ каб не вяртацца да журналістыкі. Хачу пісаць, а ўсё, што для гэтага неабходнае — адвага, своеасаблівы эксгібіцыянізм — маю. Магчыма, што калі б я засталася ў Гайнаўцы, сорам не дазволіў бы мне раскрыцца. А так у мяне няма праблемы прыстасоўвацца ў новых умовах. Маю адчуванне старой душы, гэта дапамагае. Прытым з'яўляюся экстрэмальна незалежнай асобай. Без кантролю магу дасягнуць усяго, пра што мару.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

Быў такі доктар...

Да 40 дзён пасля смерці

Лена ГЛАГОЎСКАЯ,
Гданьск, 19.12.2010 г.

Няшмат я сустракала ў сваім жыцці такіх лекараў, якім быў Даніла Дзекуць-Малей. Тым больш, што сустрэла яго не як пацыент, а як даследчык жыцця і дзейнасці ягонага бацькі Лукі — адраджэнскага дзеяча эпохі Беларускай Народнай Рэспублікі, перакладчыка Новага Запавету і псалмоў на беларускую мову ды апантанага прапаведніка Баптысцкай царквы. Так яно ўжо бывае, што пры жыцці чалавека не заўсёды ацэньваюць належным чынам, асабліва калі праходзіць яно ў цені выдатных бацькоў.

Даніла Дзекуць-Малей

З Данілам Дзекуцем-Малеем пазнаёмілася я пры магіле яго бацькі ранняй, квітнеючай вясной 1999 г. А раней у маім жыцці здарыўся проста цуд. Дата была асаблівая — каталіцкі Вялікдзень (свята ўваскрэсення Ісуса Хрыста) і праваслаўная вербніца заадно. Штосьці гэтага дня пасля царквы пацягнула мяне з сяброўкамі Ірынай і Аннай Гаданьчучкамі на Гарнізонныя могілкі ў Гданьску. У той дзень з мёртвых устаў для нас Лука Дзекуць-Малей, якога магілу, увайшоўшы на могілкі, мы нечакана для сябе пабачылі. А ў „Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" напісалі, што памёр ён у ЗША! А тут раптам з'явіўся нечакана ў Гданьску! Усё гэта было так неверагоднае, што калі б не пабачылі мы магілы на свае вочы, здавалася б гэта немагчымым. Хутка пайшла я дахаты, каб яшчэ раз праверыць звестку пра смерць Лукі Дзекуця-Малея. У энцыклапедыі ўсё ж чорна на белым напісана... Аставалася патэлефанаваць нашаму адзінаму аўтарытэту па гісторыі Беларусі — спадару Юрку Туронку. „Дзе памёр Лука Дзекуць-Малей я не ведаю, але напэўна не ў ЗША, — сказаў ён. — Пасля вайны жыў ён у Польшчы". Не ведаючы на той час абсалютна нічога пра сям'ю Лукі Дзекуця-Малея, зазірнула я ў тэлефонную кнігу Гданьскага ваяводства, каб пераканацца ў тым, што фігуруе там нейкі Даніла Дзекуць-Малей. Нягледзячы на святы, я дазволіла сабе набраць ягоны нумар. Якая была мая радасць, калі трубку падняў сын Лукі Дзекуця-Малея. Пасля я даведалася ад яго дачкі Элі, што ў іхняй хаце было таксама падвойнае свята гэтага дня. Такога не спадзяваліся, святкуючы Вялікдзень.

Дамовіліся мы на сустрэчу на велікодным тыдні са спадаром Данілам пры магіле яго бацькі. Ну, бо якое ж іншае месца можна было вызначыць на першае спатканне, калі з таго свету завочна пазнаёміў нас Лука Дзекуць-Малей? Быў цёплы красавіцкі дзень, вясна бушавала. На дрэвах паяўляліся зялёныя лісточкі. Спадар Даніла з'явіўся ў вяснянай яснай куртачцы. Выглядаў бадзёра, хаця днямі закончыў 69 год жыцця. Сівыя валасы прадказвалі не абы-якое пройдзенае. На расказ аб пройдзеным прыйшоў час за чарговымі сустрэчамі. А спадар Даніла стаў добрым дзядзькам, які не толькі расказаў пра трагічны лёс сям'і, але, маючы за сабой жыццёвы вопыт чалавека і лекара, часта раіў як жыць, каб быць здаровым. Вельмі пераймаўся хваробамі сваіх пацыентаў. Яму няважна было дзе іх сустракаў — ці на вуліцы, ці ў лекарскім пакоі. Быў спецыялістам па медыцыне працы. Магчыма таму на хваробы глядзеў як на вынік усякіх жыццёвых складанасцей. Прыпісваючы лекі, раіў як сябе трэба паводзіць у жыцці, як сабе дапамагаць у розных хваробах ды жыццёвых сітуацыях. „Кіньце ўсё ды паедзьце самі на мора, — раіў. — Трэба часам пабыць самой з сабою". Быў надзвычай прыязным для пацыентаў лекарам. У 1998 г. атрымаў адзнаку „залатога мака", якая прысвойваецца пацыентамі для найбольш любімых лекараў. Пасля дзесяцігадовага знаёмства мяне гэта абсалютна не здзіўляла. Ані разу не было такой сітуацыі, каб тым, хто звяртаўся да яго з праблемамі са здароўем, ён адмовіў. На парады ў яго заўсёды быў час. Дапамога людзям стала сэнсам ягонага жыцця. „Таму я выбраў такую прафесію, — казаў, — каб дапамагаць людзям". Была гэта ўдзячнасць рускім, якія дапамагалі яму, яго сёстрам і маці, калі яны апынуліся ў чэрвені 1941 г. у сібірскай ссылцы. Вельмі часта Даніла Дзекуць-Малей паўтараў: „Калі б не простыя рускія людзі, мы не выжылі б у Сібіры".

Яшчэ адна дэталь з жыцця Данілы Дзекуця-Малея аказалася мне вельмі блізкай — нарадзіўся ён 6 красавіка 1930 г. у Брэсце. Быў аднагодкам майго татка, які таксама да 17 верасня 1939 г. гойсаў па брэсцкіх вулках, жывучы там з бацькамі пры Каляёвай (зараз Чыгуначнай) вуліцы. Даніла са сваімі бацькамі жыў пры вуліцы Шырокай, дзе Лука Дзекуць-Малей пабудаваў баптысцкую царкву і гуртаваў сваіх вернікаў. Дзядзька Даніла ўспамінаў, што ў іхнім доме заўсёды было шмат людзей, найчасцей патрабуючых усякай дапамогі, уключна з ядой. Яго маці Серафіма, беларуская настаўніца, вяла нядзельную школку для дзяцей. Займалася і сваімі, апрача Данілы — Лукой, Елізаветай і Серафімай. Жыццё праходзіла па біблейскіх законах. Біблія была ад дзяцінства падручнай кнігай дзядзькі Данілы і ніколі з ёю не разлучаўся.

Прыход саветаў у Брэст 17 верасня 1939 г. засеяў трывогу ў сям'і Дзекуцяў-Малеяў. Баптысцкая царква была закрыта, а Лука Дзекуць-Малей вымушаны быў цяжка фізічна працаваць. Ноччу 20 чэрвеня 1941 г. НКВД вырашыла разабрацца з яго сям'ёй. Увайшоўшы ў сярэдзіне ночы ў хату, загадалі ўсім збірацца. 11-гадовы Даніла пачаў страшэнна плакаць, бачачы, як арыштоўваюць яго любімага бацьку. Тады энкавэдзіст прыкладам ударыў яго ў нос. Пацякла кроў. Пачуў невыносны боль. Нос быў паламаны. Скрыўлены астаўся да канца жыцця як памятка па той кашмарнай ночы і па савецкай уладзе. Нягледзячы на ўсё дзяцей з маці запхнулі тады ў таварны цягнік і павезлі на ўсход. „Мы ўсё маліліся", — успамінаў са слязамі ў вачах і дрыжачым голасам Даніла. Луку Дзекуця-Малея прызначылі да расстрэлу, запхнуўшы ў брэсцкую турму. На яго шчасце наступнага дня ў Брэст увайшлі немцы і вызвалілі яго з турмы, дазваляючы весці прапаведніцкую дзейнасць падчас вайны.

Даніла з сёстрамі і маці цяжка працавалі ў ссылцы, не маючы ніякага кантакту з бацькам. Маці на лесапавале перажыла клінічную смерць. Даніла плёў рыбацкія сеткі. Расказваў, што набыў такі вопыт, што мог бы і па гадах плесці іх з заплюшчанымі вачыма. Толькі ў 1946 г., пасля вайны, Луку Дзекуцю-Малею, які ўжо быў прэсвітарам у Гданьску і гуртаваў тут баптыстаў, удалося сцягнуць з Сібіры сваю сям'ю. Спярша прыехалі ў Бельск-Падляшскі, дзе заапекаваліся імі знаёмыя з даваеннага часу баптысты. А пасля прыехалі ў Гданьск. Жылі пры баптысцкім зборы па вуліцы Дамброўскага. Моладзь пайшла вучыцца ў I агульнаадукацыйны ліцэй у Гданьску. Здаўшы матуру, Даніла вырашыў паступіць на медыцыну, але „ворагу народа", які ў сваіх паперах падаваў сібірскую ссылку, не было месца ў медыцынскай акадэміі. Добрыя людзі параілі, каб не ўпісваць свайго ссыльнага эпізоду. Тады і стаў студэнтам медыцыны. Пасля ўсіх перажыванняў спярша памерла маці Серафіма — 18 лютага 1953 г., а праз амаль два гады, 20 студзеня 1955 г. — бацька Лука. Елізавета, Серафіма і Даніла былі ўжо дарослыя і кожны пачаў сваё жыццё. Даніла шчасліва закончыў медыцыну і пачаў працаваць лекарам. Завёў сям'ю. Шмат гадоў плаваў на параходах у якасці марскога доктара. Пазней працаваў сямейным лекарам у амбулаторыі. Выхаваў дачку Альжбету і ўнука Луку, якім шмат дапамагаў да апошніх дзён свайго жыцця. Пры дачцэ і ўнуку дажываў да смерці, адышоўшы ціхенька з гэтага свету 15 лістапада 2010 г. Пахаванне адбывалося 19 лістапада. Спярша ў баптысцкай царкве памерлага брата ў веры ўспаміналі баптысты з прапаведнікам Робертам Міксам, а пасля правялі ягоны прах на могілкі і пахавалі разам з маці. Ад імя беларусаў са святой памяці дзядзькам Данілам развітаўся Мацей Канапацкі, успамінаючы яго высакародную прысутнасць у нашым асяроддзі на працягу апошніх гадоў. Няхай пухам будзе яму Гданьская зямля!

Багдан ДУДКО

З цягі

тут мой кут
дзе жывуць
жураўлі...
ведаеш
я таксама нічога не ведаю
ды ведаю адно
люблю мой кут
і няхай так будзе
на векі вякоў
амін

Свіслач. Рэчка.

На лугах закрытых буйнаю
травой
яшчэ рычаць апошнія каровы
скрыпяць вясковыя журавы
на лавачках сядзяць
пры драўляных платах
апошнія бабулі
дзядуль засталося
раптам пару
у запаху ліпавага квецця
бзычаць пчолы
як дзіўна цяпер тут
дзе ўсё маё шчасце
засталося
у старонцы гэтай
дзе я радзіўся, дзе жыву

Беразіна

Маці Божая Сасновая
стаіш так непахісна
каля Цябе калышуцца сосны
і недалёка на балотах
крычаць жураўлі
дарога да Цябе крутая
выбаістая
а Ты ўсё так верна
чакаеш
каб хтосьці спыніўся
падзівіўся
спеву птушак паслухаў
— іх каля Цябе так многа —
і Твайго маўчання паслухаў
сеў на мху
і памаліўся
Маці Божая Сасновая
колькі дарог трэба прайсці
каб да Цябе вярнуцца
хоць не ведаю
хто Цябе тут
і ў якой
— слушнай ці няслушнай —
справе
памясціў
Ты стаіш
і чакаеш
непахісна

Юрка НАХІЛА

* * *

Я не быў сынам дрывасека.
Далікатны і разумны хадзіў
у школу.
Стараўся спазнаць сваё
першае каханне.
Ніколі ў мяне гэта
не атрымлівалася.
Цяпер я стары.
Не з'яўляюся сынам дрывасека.
Я не ў змозе забіць іншых.
Чакаю.
І не цікавіць мяне рэвалюцыя,
толькі маё жыццё.

* * *

Калі я паехаў бы ў падарожжа
— што кажу неграматычна
і не цікавіць мяне граматыка
толькі маё жыццё —
калі я паехаў бы ў падарожжа,
убачыў бы людзей.
Падобных, змярцвелых,
пустых.
І не сеў бы з імі на лаўцы,
бо маглі б толькі маўчаць.
А слёзы — якія ж яны
маюць значэнне?

Беларусь — хворая

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Сітуацыя ў Беларусі выклікае ў нас, паляках, беластачанах, востры супраціў, — казалі маладыя людзі, якія прыйшлі пад будынак консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку прадэманстраваць супраць няправільнасцей у час прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі і супраць затрымання і пабояў апазіцыянераў, між іншым, кандыдатаў на прэзідэнта. — Беларусы патрабуюць нашай дапамогі. Хочам паказаць, што тут, за іх заходняй мяжой, мы — разам з імі.

Пад консульства ў Беластоку прынесены былі бел-чырвона-белыя сцягі. Перад уваходам у будынак з патушаным святлом у вокнах пастаўлены былі знічы. Частка маладых людзей паявілася ў майках з выявай твару з вуснамі завязанымі калючым дротам. Арганізатары маніфестацыі са згуртавання „Праект: Польшча-Беласток" намаўлялі да таго, каб у знак пратэсту супраць падзей у Беларусі на грамадскіх сайтах замест свайго здымка ўклеіць такі ж твар.

— Гэтыя выбары не былі дэмакратычнымі. Беларусы хацелі прадэманстраваць сваю нязгоду на цяперашнюю сітуацыю. Хацелі паказаць, што такія лозунгі як свабода і дэмакратыя для іх настолькі важныя, што могуць выказаць свае перакананні незалежна ад рэпрэсій, — гаварыў сабраным перад консульствам Давід Францкевіч са згуртавання „Праект: Польшча-Беласток". — Ад нядзелі гэтае консульства павінна называцца консульствам Лукашэнкі, а не Рэспублікі Беларусь. У гэтым наша місія, каб тое, што адбываецца ў Беларусі, было агучана. Беларусам патрэбны дапамога і салідарнасць.

Адзначыў:

— Выпадак Беларусі паказвае, што яна — хворая. Як у выпадку кожнай хворай асобы дапамагае які-небудзь жэст ці мілае слова. Сёння хочам нашым беларускім суседзям паказаць, што яны не адзінокія. Беларусы маюць у нас сваіх заступнікаў у змаганні за асноўныя каштоўнасці такія як свабода, праўда і дэмакратыя.

Пад консульства прыйшло каля дваццаці маладых палякаў і грамадзян Польшчы беларускай нацыянальнасці ды беларусаў з Беларусі, які вучацца ў Беластоку. Сярод іх была Наталля:

— Я прыйшла таму, што не пагаджаюся з тым, каб у Беларусі людзей збівалі за іхнія погляды. Усе, хто сюды прыйшоў, спалучаюцца з імі прынамсі ў духу. Не ведаю, аднак, ці ёсць штосьці, што беларусам можа дапамагчы ў змаганні з рэжымам. Гэта цягнецца ўжо гадамі. Гэтая салідарнасць напэўна патрэбная, ды я асабіста не бачу святла ў тунелі. Нават магутныя еўрапейскія дзяржавы не патрапяць абмежаваць уплываў Лукашэнкі.

Кірыла з Беларусі:

— Мы прыйшлі, каб усе ўбачылі, што адбываецца ў Беларусі і каб прадэманстраваць, што ў час улады Лукашэнкі нічога ў Беларусі не змянілася ў лепшы бок. Няма шанцаў на ніякі дыялог паміж еўрапейскімі дзяржавамі і Беларуссю Лукашэнкі, незалежна ад касметычнай, часовай лібералізацыі перад выбарамі. Тое, што цяпер адбываецца ў Беларусі, гэта татальная правакацыя ўлад супраць народа, гэта вынішчэнне ўсяе беларускай нацыі. Пасля таго, што цяпер адбываецца, можа знікнуць Беларусь.

У дзень, калі адбывалася маніфестацыя пад консульствам у Беластоку, аб абвастрэнні адносін з Мінскам выказаліся асабіста прэм'ер Дональд Туск, а раней кіраўнік польскага МЗС Радаслаў Сікорскі разам са сваім нямецкім калегам. Дэпутацкае бюро падляшскага дэпутата ад ГП Роберта Тышкевіча (віцэ-старшыні сеймавай камісіі замежных спраў) некалькі гадзін да маніфестацыі перадало „Ніве" пазіцыю са спецыяльнага пасяджэння прэзідыума гэтай камісіі. Можна ў ёй прачытаць, м.інш., што арышт кандыдатаў на пасаду прэзідэнта і правядзенне вобыскаў у іх выбарчых штабах „належыць ацаніць як здзек не толькі над дэмакратычнымі нормамі, а таксама прынцыпамі цывілізаванага свету". На думку прэзідыума камісіі, выбары не могуць „быць палічанымі свабодымі і сумленнымі", а выбарчая кампанія была „інсцэніроўкай на ўжытак міжнароднай думкі, а фактычным сведчаннем улады застаюцца насілле і палітычныя рэпрэсіі". Нарэшце дэпутаты камісіі замежных спраў патрабуюць ад улад Польшчы, Рады Еўропы і Еўрасаюза рашучай і канкрэтнай рэакцыі, ажыццяўлення шырокіх дыпламатычных санкцый (замарожаных — М. Х.) для прадстаўнікоў рэжыму.

Дзень пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі і пабітай маніфестацыі ў Мінску падобныя салідарніцкія пікеты як той у Беластоку адбыліся перад пасольствам РБ у Варшаве і беларускім консульствам у Гданьску. Падобна як і ў Беластоку пратэставалі там супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў ды патрабавалі вызвалення затрыманых 19 снежня. Прагучэлі лозунгі: „Hańba", „Wolna Białoruś", „Mińsk-Warszawa wspólna sprawa". Спецыяльную заяву прадставіла м.інш. управа Беларускага культурнага таварыства „Хатка" ў Гданьску (тэкст заявы на стар. 5).

Этнагістарычны цэнтр "ЯВАР"

Радзіма для кожнага чалавека пачынаецца не з узнёслых слоў аб патрыятызме ці агляду разнастайных помнікаў. Першае, што запамінаецца кожнаму чалавеку з маленства — дзіўныя персанажы з казак, нешта чароўнае, што крыецца за нейкім каменем, у лесе ці рачной запрудзе. У сваім асэнсаванні свету чалавек нібыта праходзіць усе этапы разумення ўласным народам навакольнага асяроддзя — пачынаючы ад боязі невядомага, тлумачэння яго нейкімі міфічнымі вызначэннямі да ўсведамлення шмаграннасці сусвету.

Каб больш разумець душу народа, немагчыма пакінуць па-за ўвагай ягоныя паданні, казкі, міфы, якія дайшлі да нас з сівой даўніны. Гэта акурат тое, чым займаецца такая навука як міфалогія.

Як кожная навука, міфалогія, у тым ліку і беларуская, трымаецца не толькі на вуснай народнай творчасці, але і на вывучэнні тых прадметаў, якія сталі адпраўной кропкай у з'яўленні міфаў, казак і паданняў. Да гэтага адносяцца розныя камяні, дрэвы ці паганскія ідалы, што нейкім дзіўным чынам захаваліся да нашых часоў.

Этнагістарычны цэнтр „Явар", аб сайце якога пойдзе расповед ніжэй, створаны акурат для таго, каб вывучаць міфалагічную спадчыну беларусаў, абагульняць звесткі з розных крыніц, рабіць розныя высновы, якія так ці інакш, але тлумачаць сённяшнія беларускія погляды, страхі ці захапленні.

Сайт цэнтра месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://javvar.narod.ru.** Выглядае ён не надта прыцягальна — практычна няма аніякіх аздабленняў, на кожнай старонцы размешчаны суцэльны тэкст і амаль нічога болей. Разам з тым інфармацыя на сайце ў многім эксклюзіўная — такую цяжка знайсці недзе яшчэ ў сусветным павуцінні. Ходзіць, перш за ўсе, аб тых вандроўках навуковай накіраванасці, што ладзяць сябры „Явара".

На галоўнай старонцы сайта месціцца выява арнаментальнай кветкі. Гэта адразу дае зразумець, што мы знаходзімся на сайце, дзе будзе распавядацца аб чымсьці выключна беларускім. Ва ўсім астатнім галоўная старонка цікавая толькі тым, што месцяцца на ёй выйсці на іншыя рубрыкі.

Свайго роду прэзентацыяй этнагістарычнага цэнтра з'яўляецца старонка „Уступ". У вялікім артыкуле, які, на жаль, не аздоблены ніякай графікай, ходзіць аб дбайным захаванні нашымі продкамі сваёй гістарычнай памяці, традыцыйнай культуры. „Ад пачатку XIX ст. расійскія навукоўцы вывучалі этнаграфічныя адметнасці Паўночна-Заходняга краю, так тады афіцыйна называлі ў навуковым ужытку Беларусь. Яны, а пазней і савецкія даследчыкі, навукоўцы іншых краін у адзін голас сцвярджалі, што беларускія дадзеныя з'яўляюцца найбольш захаванымі, вельмі старажытнымі і асабліва важнымі для рэканструкцыі ўсёй пратаславянскай сістэмы будовы сусвету, якая ў сваю чаргу паходзіць ад пратаіндаеўрапейскай", — распавядаецца ў тэксце.

Другой цікавай старонкай сайта з'яўляюцца „Падарожжы". Цікаўны карыстальнік мае магчымасць пазнаёміцца са свайго роду літаратурна-мастацкімі справаздачамі, якія давалі ўдзельнікі наведванняў помнікаў матэрыяльнай культуры беларусаў. Расповеды аздоблены нешматлікімі фотаздымкамі. Таксама на сайце прадугледжана некалькі моўных версій, але толькі на беларускай адкрываюцца ўсе старонкі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

Шырокі выбар

Вызначэнне лепшых спартовак Беларусі за мінулы год ніяк не ўкладалася ў традыцыйную дзесятку. Таму, аналізуючы выступы і адбіраючы дасягненні, урэшце спынімся на „чортавым" тузіне прыступак традыцыйнага топ-парада. Прычым размяшчэнне намінантак на пазіцыях мае досыць умоўны характар.

1. Дар'я Домрачава (біятлон) у Ванкуверы (Канада) на зімовых алімпійскіх гульнях заваявала бронзавы медаль у індывідуальнай біятлоннай гонцы на 15 км, а таксама ўзяла некалькі прызоў на этапах мінулага Кубка свету. Ды і новы сезон пачала ўдала.

2. Надзея Астапчук (штурханне ядра) у Барселоне (Іспанія) на чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы ўзяла золата, дома стала чэмпіёнкай краіны, датэрмінова пераможцай „Дыяментавай лігі", а на Кубку кантынентаў паказала ў сваім відзе другі вынік.

3. Кацярына Карстан (акадэмічнае веславанне) на чэмпіянаце свету ў Новай Зеландыі на гэты раз задаволілася серабром, але зноў пацвердзіла сваё неўвядальнае майстэрства. А ў Партугаліі дадала ў сваю калекцыю чарговы тытул — чэмпіёнкі Еўропы.

4. Вольга Панарына (велатрэк) у Капенгагене (Данія) на чэмпіянаце свету стала бронзавай прызёркай у двух відах — гіце на 500 м і дысцыпліне кейрын. А ў Прушкаве (Польшча) „на Еўропе" стала ў кейрыне чэмпіёнкай.

5. Вікторыя Паўловіч (настольны тэніс) у Астраве (Чэхія) стала чэмпіёнкай Еўропы па настольным тэнісе ў адзіночным разрадзе. Усяго ў яе гэта 9-я ўзнагарода на еўрачэмпіянатах.

6. Аляксандра Герасіменя (плаванне) у Будапешце на першынстве Еўропы выйграла золата на дыстанцыі 50 м на спіне і стала сярэбранай прызёркай на 100 м вольным стылем.

7. Настасся Новікава (цяжкая атлетыка) у Анталіі (Турцыя) трэці раз запар стала віцэ-чэмпіёнкай планеты (катэгорыя да 58 кг).

8. Меліціна Станюта (мастацкая гімнастыка) заваявала бронзу ў шматбор'і на чэмпіянаце свету, а таксама 3-е месца ў практыкаванні са скакалкай.

9. Марыя Палтаран (веславанне) стала другой на адрэзку 5000 м у байдарцы-адзіночцы на еўрапершынстве, а ў Познані на чэмпіянаце свету падтрымала п'едэстальны зачын мужчын і здабыла на сваёй дыстанцыі бронзу.

10. Вікторыя Чайка (кулявая стральба) у Мюнхене (Нямеччына) стала бронзавай прызёркай чэмпіянату свету ў стральбе з пнеўматычнага пісталета, а таксама ўзяла серабро ў фінале Кубка свету ў практыкаванні на дыстанцыі 10 м.

11. Тацяна Шаракова (велатрэк) заваявала бронзу ў гонцы па ачках на чэмпіянаце свету і стала сярэбранай прызёркай у омніуме на першынстве Старога свету.

12. Тацяна Пятрэня і Кацярына Міронава (скачкі на батуце) у Мецы (Францыя) заваявалі бронзавыя ўзнагароды чэмпіянату свету ў сінхронных скачках.

13. Наталля Міхневіч (штурханне ядра) — сярэбраная прызёрка еўрапейскага форуму. А перад гэтым была другой на этапе „Дыяментавай лігі" і выйграла турнір „Moscow Open".

Што датычыць камандавых дасягненняў, то на чэмпіянаце свету па баскетболе жаночая дружына Беларусі (трэнер Анатоль Буяльскі) абыграла зборную Расеі і ўпершыню ў гісторыі выйшла ў паўфінал (выніковае 4-е месца), а Алена Леўчанка была прызнана лепшай цэнтравой першынства. Яшчэ на адным чэмпіянаце планеты — па мастацкай гімнастыцы — беларускі таксама былі на вышыні, ужо традыцыйна заняўшы 2-я пазіцыі ў камандавым турніры і групавых практыкаваннях. А жаночая чацвёрка без рулявой (Ганна Гаўра, Наталля Гелах, Наталля Гаўрыленка і Зінаіда Ключынская) перамагла на чэмпіянаце Еўропы па акадэмічным веславанні.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Час на рашучую рэформу

Уладзімір СІДАРУК

Ад 12 снежня 2010 г. абавязвае новы расклад язды. Непрадуманыя рашэнні чыноўнікаў датычныя руху і спалучэння цягнікоў, адсутнасць каардынацыі працы паміж паасобнымі чыгуначнымі суполкамі ды наступ зімы сталі прычынай усебаковага хаосу і мітусні на чыгунцы. Сродкі масавай іннфармацыі ні аб чым іншым зараз не гавораць як аб балагане ў чыгуначным транспарце. Справай заняўся ўрад. Парламентарыі ад Саюза левых дэмакратаў патрабавалі адхілення ад пасады міністра інфраструктуры Цэзары Грабарчыка. Знялі віцэ-міністра. Ці гэта вырашае шматлікія праблемы дзяржаўнага гіганта?..

Каго вінаваціць

Праблемы чыгуначнага транспарту ўсім добра вядомы. Гаварылася раней аб іх у парламенце, выказваліся прадстаўнікі самаўрадаў і патэнцыяльныя кліенты. Спазненні цягнікоў, неабагрэтыя і брудныя вагоны, дэзінфармацыя пасажыраў сталі штодзённай рэчаіснасцю. Мне, як былому чыгуначніку, а заадно пенсіянеру, праблемы найлепш вядомыя. Ставіў я іх на грамадскі суд на старонках „Нівы". Адмяненне з пасады міністра ці віцэ-міністра не вырашае праблемы. Прычын трэба шукаць, па-мойму, у няправільным кіраванні паасобнымі суполкамі і адсутнасці каардынацыі працы паміж імі. З-за гэтага ўзнікаюць недамоўкі (найчасцей наконт ставак) паміж Рэгіянальнымі перавозамі і Прадпрыемствам чыгуначнай маёмасці або ПЛК і перавозчыкам. Змяняюцца ўрады, прэзідэнты, а старшыні чыгуначных суполак, быццам „святыя каровы", застаюцца на сваіх пасадах. Гэта яны адказваюць за працу і парадак у сваіх прадпрыемствах. Гэта яны давалі загады мадэрнізаваць і рэструктурызаваць свае ўстановы ў рыначнай эканоміцы. Праўда, вялікай памылкай было рашэнне парламента ў справе падпарадкавання Рэгіянальных перавозаў мясцовым самаўрадам без грашовай падтрымкі. Зараз гэтае прадпрыемства мае каля дзесяці мільярдаў злотых даўгу і стаіць на грані банкруцтва. Тут неабходная рашучая рэформа. А на гэта патрэбныя грошы. Без грошай нічога не зробім. Не без значэння застаецца аднак факт неадпаведнага выкарыстання еўрасаюзных сродкаў. Большасць грошай прызначаецца на будову і мадэрнізацыю дарог, а для чыгуначнага транспарту ледзь хапае на хусцінку для выціранння слёз. І аб гэтым трэба падумаць кіруючай Грамадзянскай платформе.

Прыклад з уласнага панадворка

Апошні расклад язды скараціў лік цягнікоў на лініі Чаромха — Беласток на адну пару. Асноўнай заганай з'яўляецца тое, што адмянілі вячэрні рэйкавы аўтобус з Беластока ў 18:40. Зараз у напрамку Чаромхі апошні цягнік ад'язджае ў 15:51. А чым дабрацца дамоў пасля дзённай службы чыгуначнікам (ды не толькі) з наваколля Бельска-Падляшскага і Чаромхі? З адмяненнем вышэйзгаданага цягніка ўзнікае іншая праблема. Вось гэтаму прыклад.

Вяртаўся я дамоў з Беластока ў сераду, 22 снежня. Калі зайшоў я на чацвёрты перон а палове чацвёртай пасля абеду, рэйкавы аўтобус на 15:51 не быў падстаўлены. На пероне згуртавалася каля пятнаццаці чалавек, штораз падыходзілі іншыя. Варта прыкмеціць, што ў гэты дзень школы адпускалі вучняў на святочныя канікулы і многія з іх гэтым цягнікам вярталіся дамоў. Рэйкавы аўтобус з-пад паравознага дэпо рушыў на манеўры ў 15:40 і ў пероны заехаў у 15:48. Да ад'езду заставаліся 3 мінуты. Але праз гучнагаварыцель паведамілі, што рэйкавы аўтобус у Чаромху ад'едзе са спазненем каля 60 мінут. Ніхто не ведаў прычыны. Пасля выявілася, што чакалі цягніка з Чаромхі, які прыбывае ў Беласток у 16:30. Як мне сказала знаёмая чыноўніца з Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу, такое ж было і дзень раней. Тады, 21 снежня, цягнік выехаў з гадзінным спазненнем. Калі я паспрабаваў высветліць справу ў кіраўніка цягніка (ён перасеўся з чаромхаўскага аўтобуса ў наш), дык гэты заявіў: „Не ведаю навошта чакалі. Я меў перасесціся на станцыі Лявіцкае (па правіле) у чаромхаўскі цягнік, але семафор быў адкрыты, дык я вымушаны быў ехаць у Беласток. Адным словам, няма віноўных. А мо Маршалкоўская ўправа паклапоціцца і запытае перавозчыка па-першае, чаму так позна ў Беластоку падстаўляюць цягнікі ў пероны; па-другое, калі адменяцца спазненні на чаромхаўскай лініі і калі вернуць адмененую ў апошнім раскладзе язды пару цягнікоў. Вышэйпрыведзеныя прыклады сведчаць аб балагане не на вярхушцы, але на беластоцкай станцыі. І за гэта павінны быць прыцягнуты да адказнасці беластоцкія віноўнікі.

Адгаданка

1. між чацвяргом і суботай, 2. сакрэтнае ўмоўнае слова для апазнання сваіх на вайсковай службе, 3. вузкія сталёвыя палазкі для катання на лёдзе, 4. літоўскі порт, 5. гандлюе мясам, 6. заходнееўрапейская чараўніца, 7. пераможнае заканчэнне шахматнай партыі, 8. імя гарошкаўскага паэта, 9. сталовая з падачай заказных страў, 10. з яе крупы і рэдка мука (*Fagopyrum*), 11. клубок лятучых насякомых, 12. здвоены веласіпед, 13. злакавы конскі ласунак, 14. установа з міністрамі, 15. горад з Крамлём, 16. кітайская сталіца, 17. за Юпітэрам, 18. славянскі язычніцкі апякун жывёлагадоўлі і мастацтва, 19. усходні мужчынскі галаўны ўбор у выглядзе доўгага кавалка тканіны абгорнутага некалькі разоў вакол галавы, 20. квадрат дзесяці, 21 наприклад асётр, 22. негатыў негатыва, 23. квадратны корань з дваццаці пяці, 24. галоўны башкірскі горад.



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — страфа Ніны Аксёнчык.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 48 нумара

Падмога, Рыга, скальп, яблыня, тайга, вагон, невук, Вісла, тры, сыравіна, каштан.

Рашэнне: **Бяды гультайствам не выправіш.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебодзіцаў і **Яну Міхалюку** з Чыжоў.

02.01 — 08.01

(22.03. — 20.04.) Новы год сустракаеш весела, з прытупам. Многа спраў пачнеш аднова. Цяпер ты будзеш раздаваць карты! Можаш зрабіць пераломнае. Паявіцца шанц, якога ты чакаў 12 гадоў! Зацьменне Сонца 4.01. прынясе крыху непрыемнасці на працы. Ведай свае правы і не дазволь, каб цябе ставілі ў кут.

(21.04. — 21.05.) Новы год можаш пачаць моцным акцэнтам. Адкрыюцца перад табою новыя магчымасці. Многа новых ідэй, інспірацый. Ды 2-6.01. хтосьці быццам бы табе прыхільны можа пачаць гуляць на два франты. Будзь асцярожны!

(22.05. — 22.06.) Заззяеш інтэлігентнасцю, удалымі ідэямі і небанальным гумарам. Справішся пры любых умовах. Бязбольна ўвядзеш нейкія змены. На працы цудоўна, бо без знясільвання, а паспяхова. Даруеш іншым памылкі, таму, хто цябе падвёў, дасі другі шанц. Заглянь да лекара, задбай аб здаровы лад жыцця.

(23.06. — 23.07.) Нічога не выйдзе з планаваных самотных вечароў з кнігай. Не ўмееш танцаваць? Запішыся на курсы! Папраўляцца твае адносіны з атачэннем. Дагаворышся нават з тымі, з кім не было табе па дарозе. 4.01. не вер падлізнікам; можаш сустрэць асобу, якая цябе схоча абдурыць.

(24.07. — 23.08.) Вельмі ўдалы месяц. Дом — аазіс. 4.01. можаш мець горшы настрой (не папраўляй яго сабе алкаголем!). Наведай лекара, без пратэстаў паддайся абследаванням. Зважай на коўзкія тратуары. 5-9.01. можаш быць нервовым; толькі не спрачайся з шэфам!

(24.08. — 23.09.) Не адмаўляй сабе прыемнасцей. Жыві на ўсю катушку — добра на гэтым выйдзеш. Адпачынак, радасць. Не плануй кожнай гадзіны па хвілінах. У пачуццях вялікія поспехі. У першай палове месяца не выканаеш сваіх 200 працэнтаў нормы, ну дык і што? Памагай іншым, ды не дай сябе выкарыстаць!

(24.09. — 23.10.) Шалёныя і геніяльныя ідэі. 4-8.01. — ідэальны момант на размову, якой баішся; пойдзе ўсё як хочаш. 2-6.01. не фарсіруй сваіх ідэй; счакай, каб не быць стратным. Перад табою перспектывы павышэння, паправы ў заробках, ды не будзь лішне энтузіястычным!

(24.10. — 22.11.) Сёлета чакаюць цябе ўдачы, але дзякуючы тваёй працы і сіле волі. Адчуеш, што гэта ты кіруеш сваім жыццём. Рашучасць, прыліў сілы; зрэалізуеш усе свае намеры. Ды 2-6.01. лепш абмінай крамы, бо за вялікія грошы купіш барахло. Нялёгка цяпер табе закрунуць у галаве ў пачуццях. Ды на працягу года ў каханні лёс да цябе ўсміхнецца!

(23.11. — 22.12.) Неспакойны месяц. Рыхтуйся на мноства змен (некаторых чакаеш, іншыя цябе заспеюць). 2-7.01. будзеш асмелены да правядзення сваіх намераў. Самотныя Стральцы будуць фліртаваць на ўсю катушку, а нагод будзе шмат! Пагодзішся са сваякамі. Не параўноўвайся з іншымі.

(23.12. — 20.01.) Правядзеш грунтоўны перападлік сваіх спраў, мабыць, нікога не слухаючы, мусіш аднак узяць на сябе адказнасць за свае выбары. Ахвота падпарадкаваць партнёра; адпусці крыху і не патрабуй зашмат! 5-9.01. будзе табе здавацца, што ўсе супраць цябе. Ды маеш магчымасць да ўнутранай перамены; пакінь крыўды, балючыя ўспаміны і правіны.

(21.01. — 19.02.) Сёлета можаш выплысці на шырокія воды! 2-6.01. ніхто не ўстаіць перад табою. Будуць прыхільныя нават працаўнікі! Ужо з 3.01. адчуеш сябе проста камфортна. Не ўсядзіш на месцы, усюды будзе цябе поўна, будзеш рабіць новае ў розных галінах. І ўсё будзе цябе цягнуць да змены працы; не стаў спраў рубам.

(20.02. — 21.03.) Ненайлепш у кантактах; не разлічвай на тое, што хтосьці дасць табе што дарам. Ды паможа табе той, на каго ты не разлічваў! Адпачывай, бо і так зробіш няшмат. У пары не блукай у аблоках. Асабліва мяркуйся пры новапазнаных асобах.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Цуд маем закладзены ў генах!

Ганна КАНДРАЦЮК

(пачатак у 52 н-ры)

Пасля трох гадзін язды, калі не выпадала ўжо вяртацца дамоў, наш духовы апякун абвясціў:

— Moi drodzy, cudowne zjawiska, to nie jest sprawa długoterminowa!

Пасля такога ўступу мы чакалі, што скажа далей...

Але пакуль што да чаго, мова пайшла пра міратачывасць ікон, пра тое, што з'яву нельга вызначыць у часе ці адгадаць, які знак пасылае нам неба. Цуд можа трываць адзін дзень, месяц або год, пасля спыніцца. Як вядома, ён не паддаецца навуковым правілам ды апошнім часам у праваслаўі закінулі даследаваць з'яву. Ніхто не ведае яго паслання. Ці гэта божая ласка людзям? А можа перасцярога перад надыходзячым няшчасцем? У 1937 годзе міраточыла ікона ў наваколлі Грубяшова. Як пасля аказалася, прадвяшчала яна сумнавядомую акцыю «Вісла». Зараз таксама нельга адназначна сказаць які камунікат пасылае нам цудоўнае здарэнне ў Тарэспалі. Ды, як павучылі нас у дарозе, спадзяванні лепш пакласці на веру ў промысел Божы. Словам: *не нам пра гэта судзіць.*

Пасля мы пачулі сумную навіну.

— Ікона Божай Маці „Скорапаслушніцы" ў Тарэспалі ўжо не міраточыць!

* * *

— *От тобіэ на!* — пракаментавала Вольга.

Апошняя інфармацыя ніякім чынам не пахіснула нашай веры ў цудоўную з'яву, наадварот, усё, што адбылося да гэтай пары ў Тарэспалі, здалося яшчэ больш неразгаданым, таемным. Ды і настрой, які атрымаўся ад паездкі, рабіў сваё. Мая суседка ў кажусе з аўчын напамінала родную маму. Жанчына сама па сабе расказала пра сваё жыццё, якое ў сутнасці зводзілася да аднаго: служыць і ахоўваць сям'ю. Зараз, напрыклад, яна, васьмідзесяцігадовая пенсіянерка, заапекавалася хворым пляменнікам, які пасля смерці бацькоў сам гараваў на вёсцы. Бо ж грэх пакінуць чалавека без апекі, адвярнуцца плячыма. Ён сам не хацеў ісці ў пансіянат для састарэлых. Ды замалая ў яго *рэнта*, каб прыгарнулі ў якім спакойным добрым месцы...

У словах маёй суседкі адчувалася звышнармальная дабрыня, так характэрная падляшскай жанчыне. Яна прасочвалася між мацярынскіх слоў пра дачок і ўнукаў, пра мужа ды хворага сваяка. Пад яе крыллямі добра было мроіць пра пах святога ялею, які ведаю найперш «з кніжкі». Мала хто звяртае ўвагу на пахавыя ноткі міра. Святы ялей можна набыць у царкоўных крамах у Гродне або ў Кіеве, у Жыровічах ці ў Луцку. Яго прапануюць у дзесятках варыянтаў, у флаконах, прыздобленых паэтычна-хрысціянскімі расейскімі назовамі *«Назарет»*, *«Віфлеем»*, *«Гора Афон»*... Такі ялей мае трывалы пах і наклікае настрой спакою. Яго тэхналогія зразумелая — святыя ялеі паводле старых рэцэптаў вырабляюць у манастырах за ўсходняй мяжой. Ёсць таксама міра, якое з'яўлецца невядома адкуль. Яно наплывае з паветра або з галавы, каб прадказаць нам сустрэчу з цудоўным. Упершыню такі пах знюхала я ў час чытання агіяграфіі жыровіцкіх святых. Ён залунаў нечакана з друкаваных старонак сціплай кніжыцы пра святых старцаў. Пах ялею прадказваў тады нечаканую сустрэчу (вядома ў кніжцы) з асобай Серафіма Жыровіцкага, які ў даваенныя гады служыў на парафіі ў Курашаве, пяць кіламетраў ад маёй роднай хаты.

Фота Ганны Кандрацюк

Ці існуе розніца між канкрэтным і ўяўным пахамі святога ялею?

Ва ўяўным паху міра прасочваўся пах сонечных праменняў. Быццам разам са святлом, ён на міг з'явіўся з неба.

* * *

Той рэлігійны кайф, якія найлягчэй адчуваецца ў арганізаванай групе, быў толькі прыступкай да таго, што спаткала нас у Тарэспалі. Пасля першай, сумнай навіны, пра тое што ікона «Скорапаслушніцы» ўжо не міраточыць, мы пачулі яшчэ іншую гісторыю. Аказваецца, цудоўныя з'явы не спыніліся ў Тарэспалі. Наадварот, у кватэры гімназіста Лукаша Паплаўскага зноў пачалі міраточыць іконы ў святым кутку. Таксама ў царкве, куды набліжалася нашае паломніцтва, «сцякае» мірам ікона святых мучанікаў, звязаных з беларускай і ўкраінскай землямі: Гаўрыіла Заблудаўскага, Афанасія Брэсцкага, пакутніка Грыгорыя, пакутніка Максіма, прападобнага Іова Пачаеўскага.

Па сённяшні дзень маю ў памяці сумна-строгі погляд святых у правым кутку іканастаса, тую радасную трывогу, якую наклікала атмасфера цуду. У месцах дзе цуд людзі не адчуваюць страху.

(працяг будзе)

Віншуем са Святамі!

ISSN 0546-1960